Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№ 64 (28428)
5 КРАСАВІКА 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
№ 11 (395)
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



Ці магчыма жыць без датацый? МС



Жыхарка аграгарадка змагаецца за экалогію МС




Смеццеправоды заварылі. Што далей? МС

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Будуць аднаўлены пастаўкі нафты ў Беларусь у тых аб'ёмах, якія прапісаны ў дзеючым пагадненні, гэта значыць па 24 млн тон на год. Такія аб'ёмы павінны пастаўляцца з гэтага года і да 2024-га ўключна. Дасягнутыя дамоўленасці выгадныя для нас. Да 2019 года ўключна 18 млн тон з агульнага аб'ёму будзе накіроўвацца на перапрацоўку на НПЗ. Для нас гэта абсалютна прымальна, гэта выгадна для заводаў. Яшчэ 6 млн тон будуць «перамытнявацца», важна, што пошліны ад гэтай перамытні будуць паступаць у бюджэт Беларусі. Агульны эканамічны эфект ад дасягнутых дамоўленасцяў па нафце і газе ў найбліжэйшыя тры гады ацэньваецца экспертамі прыкладна ў $2 млрд».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8868 | ▲ |
| Еўра | 2,0085 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0333 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0695 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# МІЛЫЯ ВОБРАЗЫ РОДНАГА КРАЮ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Вікторыя МАКСІМАВА і Соф'я ГЕЙЦ – студэнткі БДТУ, любуюцца возерам Белае, якое знаходзіцца ў Брэсцкім раёне. Вікторыя — будучы спецыяліст у сферы турызму, Соф'я — ландшафтны дызайнер. Адкрыццё новых прыродных аб'ектаў краіны і знаёмства з цікавымі экалагічнымі маршрутамі натхняе дзяўчат на творчы падыход да абраных прафесій.**

ТЭМА ДНЯ

# ЯК ПРАДАЦЬ, КАБ НЕ ПРАГАДАЦЬ?

## У абласным цэнтры шмат пабудоў, якія пустуюць. Як іх лепш выкарыстаць, раіліся на пасяджэнні Брэсцкага гарвыканкама

**У кантэксце размовы пра пустуючыя аб'екты мы прывыклі згадваць вясковыя школы і клубы, будынкі фермаў і магазінаў, ну... яшчэ базы цэлых ваенных гарадкоў, нярэдка з камунікацыямі, што дыслацыраваліся недзе ў лясах. Але ж і ў горадзе такой маёмасці многа. Дастаткова сказаць, што пятая частка ўсёй маёмасці вобласці, якая не выкарыстоўваецца, знаходзіцца ў Брэсце.**

### За адну базавую

Брастаўчане, асабліва старэйшага і сярэдняга пакаленняў, добра ведаюць басейн «Лазурны». Некалі гэта быў ведамасны спартыўна-аздараўляльны аб'ект аднаго з прадпрыемстваў горада. Потым стаў часткай гарадской інфраструктуры. Сюды хадзілі школьнікі на ўрокі па плаванні, гараджане з суседніх дамоў і вуліц набывалі абанементы. Але з часам басейн запатрабаваў рэканструкцыі або капітальнай перабудовы. Вырашылі пашукаць інвестара. Першы раз аб'ект быў выстаўлены на аўкцыён у жніўні мінулага года. Тады за трохпавярховы будынак плошчай 1,5 тысячы квадратных метраў прасілі 126 619 рублёў. Але ахвотных купіць пабудову не знайшлося. Яно і зразумела, былы басейн патрабуе вялікіх капіталаўкладанняў.

У выпадку пакупкі аб'екта новы гаспадар атрымлівае права арэнды зямельнага ўчастка плошчай 23 соткі на 10 гадоў. За асобную плату, амаль сімвалічную, прапануюць набыць камплект абсталявання: чатыры бойлеры, два катлы для водаачысткі, электрапомпавы агрэгат, помпу, рэгулятар тэмпературы, бактэрыцыдную ўстаноўку. Па ўмовах продажу пакупнік можа пакінуць басейн, калі праўдзе рэканструкцыю, можа пераабсталяваць пад нешта іншае, а можа наогул знесці і пабудаваць нешта сваё.



Будынак басейна «Лазурны».

Самае галоўнае, што перад сакавіцкімі таргамі цана ўжо была зніжана да адной базавай велічыні. Але таргі не адбыліся, бо не было заявак. І гэта аб'ект не на ўскраіне горада, а ў даволі ажыўленым заводскім раёне...

Падчас абмеркавання адной з прычын беспаспяховай спробы продажу называлі недахопы ў правядзенні рэкламнай кампаніі. Можа, і так. Але ж відавочна, што і інвестыцыйная актыўнасць бізнесу апошнім часам не на вышыні. Таму і не хутка прадаюцца асобныя аб'екты.

стар. 3

# Спрэчных момантаў не засталося

## Беларусь і Расія ўрэгулявалі ўсе пытанні ў двухбаковых адносінах

**Такі вынік сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, якая адбылася 3 красавіка ў Санкт-Пецярбургу.**

Як ужо паведамлялася, перагаворы кіраўнікоў дзяржаў доўжыліся больш за пяць гадзін. Яны праходзілі спачатку ў фармаце «сам-насам», а затым у пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый.

Па выніках перагавораў Беларусь і Расія дамовіліся аб сумесных дзеяннях у сферы забеспячэння бяспекі. «Вы бачыце, што адбываецца навокал. І мы хацелі б проста захаваць стабільнасць у Расіі і Беларусі. Ужо занадта мала засталося ў гэтым свеце ціхіх, спакойных кропак. І мы дамовіліся аб сумесных дзеяннях па захаванні бяспекі ў нашых дзяржавах», — заявіў беларускі лідар.

На сустрэчы таксама былі вырашаны спрэчныя пытанні ў нафтагазавай сферы, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Бакі вызначылі адпаведную схему і знайшлі магчымасць для ўзаемных саступак. Чакаецца, што далейшыя неабходныя рашэнні будуць прыняты ў найбліжэйшыя дні.

Прэзідэнты пацвердзілі сваё імкненне стварыць да ліпеня 2019 года неабходныя асноватворныя правілы і ўмовы па стварэнні адзінага рынку электраэнергіі. Пацверджана гатоўнасць зрабіць усё для таго, каб да 1 студзеня 2018 года распрацаваць сумесныя правілы па адзіным рынку газу, а да 2024 года распрацаваць і выйсці на падпісанне міжурадавага пагаднення ў рамках ЕАЭС па адзіным рынку газу.

Яшчэ адной важнай тэмай перамоваў стала развіццё ўзаемадзеяння ў аграрнай і прамысловай сферах. Бакі палічылі неабходным дэталёва абмеркаваць гэтыя пытанні ў час пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета і па яго выніках прыняць канкрэтныя рашэнні. Шмат часу было аддадзена абмеркаванню супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі. Расійскія спецыялісты ў хуткім часе наведаюць беларускія прадпрыемствы, у дачыненні да якіх у іх узнікалі сумненні з пункту гледжання захавання фітасанітарных нормаў, і абмяркуюць з калегамі праблемныя пытанні ў гэтай сферы.

Лідары дзвюх дзяржаў удзялілі ўвагу і ўзаемаадносінам у сферы фінансаў, у канкрэтных галінах эканомікі, у тым ліку ў высокатэхналагічных сферах. Гаворка, у прыватнасці, ішла аб магчымым пашырэнні сумеснай работы ў касмічнай сферы. Акрамя таго, расійскі бок пайшоў насустрач у пытанні рэфінансавання існуючых у гэтым годзе запазычанасцяў перад Расійскай Федэрацыяй.

Асобна падчас перамоваў падымалася праблематыка міжнароднага парадку дня. «Асабліва тых пытанняў, якія датычацца нас, нашых суседзяў, палітыкі Еўрасаюза. Абмяняліся думкамі аб узаемаадносінах з ЗША, як выбудоўваць гэтыя адносіны», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Я, вядома, прасіў Уладзіміра Уладзіміравіча, каб ён не забываў і пра Беларусь, выбудоўваючы адносіны з буйнымі дзяржавамі. Яго чакаюць сустрэчы ў «дзвацццатых». Я атрымаў запэўніванні ў падтрымцы нас на ўсіх форумах, як гэта ён рабіў і раней», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў расійскаму лідару за тое, што, нягледзячы на падзеі, якія адбыліся, бакі знайшлі магчымасць сесці за стол перамоваў. У сваю чаргу Уладзімір Пуцін заявіў, што на сённяшні дзень у беларуска-расійскіх адносінах не засталося спрэчных пытанняў.

КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

# НАПЕРАДЗЕ — ШМАТ ПРАЦЫ

## Кіраўнікі пастаянных камісій Савета Рэспублікі расказалі аб планах работы на найбліжэйшы час

**На адкрыцці другой сесіі Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, спікер верхняй палаты беларускага парламента, дакладна акрэсліў для кожнай Пастаяннай камісіі кірункі будучай работы. Пра тое, якім чынам яна будзе выбудоўвацца, «МС» распытала ў кіраўнікоў камісій. Сёння мы пачынаем публікацыю гэтых меркаванняў.**



**Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:**

— Прэзідыумам Савета Рэспублікі ўжо прынятыя пастановы, накіраваныя на выкананне Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады, але час прыспешвае і жыццё ідзе далей. Нам неабходна падкарэктаваць сваю дзейнасць з улікам прынятых кіраўніком дзяржавы і ўрадам нарматыўных прававых актаў.

У гэтых мэтах падрыхтаваны праект Пастановы Прэзідыума Савета Рэспублікі «Аб садзейнічанні фарміраванню заканадаўчай базы, якая забяспечвае выкананне Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады і комплексу мер па яе рэалізацыі». Пастанова прадугледжвае зацвярджэнне Плана мерапрыемстваў па ўдзеле Савета Рэспублікі ў падрыхтоўцы законапраектаў, прадугледжаных комплексам мер па рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады. У яго аснову пакладзена 31 мерапрыемства з 380 пазіцый комплексу мер па рэалізацыі Праграмы.

На маю думку, Пастаянным камісіям і Сакратарыяту Савета Рэспублікі трэба перш за ўсё аказваць садзейнічанне (у межах кампетэнцыі) дзяржаўным органам у падрыхтоўцы законапраектаў, пералічаных у плане, а таксама ў выкананні мерапрыемстваў, прадугледжаных комплексам мер. Да таго ж варта кіравацца планам пры выбары аб'ектаў маніторынгу практыкі прымянення законаў Рэспублікі Беларусь, тэм для разгляду ў ходзе круглых сталоў, семінараў і іншых мерапрыемстваў, пры выпрацоўцы прапаноў па фарміраванні праекта плана падрыхтоўкі законапраектаў на чарговы год. Інакш кажучы, план павінен стаць арыенцірам для арганізацыі нашай заканатворчай дзейнасці да 2020 года.



**Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

— Зараз Кодэкс аб адукацыі вельмі актыўна абмяркоўваецца на розных узроўнях, праводзіцца яго экспертыза, аналіз. Гэты дакумент, у адрозненне ад Кодэкса аб культуры, ужо дзейнічае. Зараз у яго ўносіцца новая норма, якая адпавядае развіццю сістэмы адукацыі, датычыцца фарміравання інфармацыйнай супольнасці, у якой мы непасрэдна знаходзімся. У Кодэксе ёсць прагрэсіўныя кірункі развіцця адукацыі: дыстанцыйная адукацыя, сеткавая форма арганізацыі работы. Мы стаім на тых пазіцыях, каб Кодэкс з'яўляўся больш канцэптуальным дакументам, які б перш за ўсё змяшчаў стратэгію развіцця сістэмы адукацыі ў цэлым, а ўжо канкрэтыка павінна закладвацца ў іншых палажэннях, указах, звязаных з ім.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

**(Працяг у наступным нумары «МС».)**

# ПА СТАРОНКАХ ПЕРШАЙ КНІГІ

**Кніжную выстаўку, прысвечаную 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, сёлета пакажуць у Кітаі, Расіі, Сербіі, Чэхіі і Польшчы. Днямі яе адкрылі ў Савеце Рэспублікі. На ёй можна ўбачыць не толькі кніжныя навінкі, але і тое, як іх рабілі паўтысячагоддзя таму. Парламентарыі змаглі ўласнаручна стварыць паперу і афорт старонкі з Бібліі.**

— Калі на ўзроўні парламента краіны, на высокім дзяржаўным узроўні разглядаюцца пытанні нацыянальнай культурнай, гістарычнай, кніжнай спадчыны, мы з поўнай упэўненасцю можам сказаць, што Беларусь дбае пра сваю будучыню і мацуе гэту будучыню менавіта на прынцыпах высокай духоўнасці, — адзначыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**

Сёлета звыш двух мільёнаў рублёў дзяржава выдаткавала на падтрымку нацыянальнага кнігавыдання. Яны накіраваны на праекты ў мастацкай літаратуры і энцыклапедычным кнігавыданні. У гэты юбілейны год плануецца правесці звыш 70 мерапрыемстваў, прысвечаных круглай даце. У сакавіку кіраўнік дзяржавы падпісаў указ аб стварэнні шматтомнага выдання «Рэспубліка Беларусь: дасягненні апошніх 25 гадоў». Яно ўбачыць свет у 2018 годзе. «Мы цяпер працуем над стварэннем праекта электроннай энцыклапедыі Рэспублікі Беларусь, — паведаміла Лілія Ананіч. — Сёння энцыклапедыя — гэта пашпарт краіны. Тое, што мы здолелі захаваць у друкаваным выглядзе, і тое, што павінна развівацца з улікам сучасных электронных носьбітаў».

Падчас адкрыцця выстаўкі былі закрануты і пытанні абароны інтэлектуальнай уласнасці. **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА** звярнула ўвагу на тое, што кніга — гэта вынік працы не толькі аўтара, але і выдаўца. «Упершыню ў праекце Закона «Аб аўтарскім праве і сумежных правах», у рамках які будуць унесены вельмі важныя нормы для выдаўца. Адна з іх — норма аб свабодных ліцэнзіях. Свабодныя ліцэнзіі і нормы ў літаратуры даюць магчымасць аўтару дэлегаваць свае паўнамоцтвы ў рамках выключнага права на твор неабмежаванаму ліку асоб. Такія свабодныя ліцэнзіі з'яўляюцца прамежкавымі паміж класічнымі ліцэнзіямі, якія дазваляюць абараняць правы аўтара, і свабодным доступам да інфармацыі, у тым ліку і ў інтэрнэт-прасторы».



Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ і член Савета Рэспублікі Мікалай РАДАМАН.

Савет Рэспублікі ініцыюе ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтар-

Нарматыўна-прававое рэгуляванне выдавецкай дзейнасці разглядзелі падчас першага пасяджэння вясновай сесіі Савета Рэспублікі. На ім жа абмеркавалі святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і правядзенне мерапрыемстваў, прымеркаваных да Года навукі. Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч уручыў Ганаровую грамату Нацыянальнага сходу галоўнаму навуковаму супрацоўніку Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Георгію Галенчанку за вялікі ўклад у рэалізацыю сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і шматгадовую плённую навукова-даследчую дзейнасць. Ён аўтар шматлікіх даследаванняў па гісторыі беларускага кніжнага друку, духоўнай і кніжна-пісьмовай культуры Беларусі XIV—XVII ст.



Фота БЕЛТА.

Генеральны пракурор Аляксандр КАНЮК, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый МІЦКЕВІЧ і старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.

Святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання — гэта падзея не толькі нацыянальнага, але і сусветнага маштабу, лічыць **рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Кацярына ДУЛАВА**: «Пра гэта сведчыць і той факт, што ЮНЕСКА адзначае гэту дату. Што датычыцца прадстаўленай тут экспазіцыі, яна так ці інакш расказвае пра гісторыю кнігі ў Беларусі. Дзякуй богу, што ў краіне ёсць энтузіясты, якія імкнуцца і могуць паказаць на станках, як кнігі рабіліся ў тыя часы. І нават даюць паспрабаваць сябе ў якасці першадрукара».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

НА МЕСЦАХ

# ІНІЦЫЯТЫВУ НЕАБХОДНА АБУДЗІЦЬ

## Рэгіёны вучацца вырашаць пытанні самастойна

**Мясцовая ўлада можа падтрымаць маладых прадпрымальнікаў, але, як паказаў эксперымент, адпаведную інфармацыю днём з агнём не знойдзеш... Актуальныя пытанні гэтай і іншай работы ў раёнах абмеркавалі на круглым стале «Аб рабоце органаў мясцовага самакіравання па рэалізацыі паўнамоцтваў, дадзеных Законам Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», па павышэнні ўзроўню жыцця насельніцтва».**


www.pac.by

### ПРАВЯРАЕМ НА САБЕ

Пра згаданы эксперымент расказаў **першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Аляксей ВАСІЛЬЕЎ**. У рэгіёны адправілі маладых людзей, якія цікавіліся, ці можна там, на месцы, адкрыць свой бізнес. І як рэгіёны сустракаюць прадпрымальнікаў? «У сярэднім у абласцях па 20 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. З іх поўная інфармацыя пра Указ 255, які дае магчымасць вылучаць з раённых бюджэтаў грашовыя сродкі прадпрымальнікам для набыцця аб'ектаў нерухомасці, была на сайце толькі аднаго раёна. Назва Указа — яшчэ на двух. У астатніх на сайтах не было ніякай інфармацыі. У тых рэгіёнах, якія людзі наведвалі, інфармацыю давалі, казалі пра тое, што ёсць аб'екты нерухомасці. Але рэгіён не мог прапанаваць, чым заняцца маладому прадпрымальніку».

Такая сістэма падыходзіць для тых, хто ведае, якую справу хоча адкрываць. Але калі паглядзець на гэту сітуацыю праз Дэкрэт №3... Напрыклад, пры аптымізацыі вытворчасці вызваляюцца людзі, якія 10—15 гадоў працавалі на заводзе. Яны не ведаюць, якім відам прадпрымальніцтва найбольш выгадна займацца. Ім трэба дапамагчы. На жаль, сёння раён у гэтым кірунку даць параду не можа. Гэтым пытаннем часткова займаюцца бізнес-інкубатары. Але на тэрыторыі Мінскай вобласці іх усяго каля 20, і ўсе размешчаны блізка да сталіцы. Тым часам у Віцебскай вобласці бізнес-інкубатар наогул адзін.

### НА ПРЫКЛАДАХ

На круглым стале разгледзелі і вынікі пяцідзённай вучобы, якую Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь праводзіла для старшынь раённых Саветаў дэпутатаў. Разам з тэарэтычнымі заняткамі разглядалі і практычныя пытанні ў Талачынскім раёне. **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Аляксандр ПАПКОЎ** адзначыў, што сёння галоўнае — звяртаць увагу на тыя праблемы, якія хвалююць людзей. На адным з першых месцаў па значнасці — Дэкрэт №3. «Беспрацоўе 1% — гэта фікцыя. Гэта тыя, хто стаяў на ўліку ў цэнтры занятасці. Сапраўдныя лічбы зусім іншыя». Цяпер ВНУ выпускаюць у два разы больш студэнтаў, чым 20 гадоў таму. Значная частка навучаецца завочна, а працу потым людзям прапанаваць не могуць.

### КАЛІ БУДЫНАК НЕ ПАТРЭБНЫ

Асобным пытаннем стала ўцягванне ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці і выкарыстоўваецца неэфектыўна. Выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі на гэту тэму назначана на 14 красавіка ў Дзяржынскім раёне. Аляксей Васільеў, які таксама курыруе рабочую групу па падрыхтоўцы да пасяджэння, расказвае, што асноўныя аб'екты ў раёнах, якія могуць быць задзейнічаны ў эканоміцы, — гэта будынкі акцыянерных таварыстваў і сельгасарганізацый. «Уцягванне павінна мець стратэгічны характар, трэба бачыць развіццё гэтых аб'ектаў з улікам Дэкрэта №3». Цяпер усе аб'екты, якія не выкарыстоўваюцца, замацоўваюцца за ЖКГ. І затраты на гэта пакрываюцца за кошт раённага бюджэту. Фактычна, заплаціўшы падаткі, мы плацім і за гэта абслугоўванне.

Але сітуацыі ў рэгіёнах розныя. Цяжка знайсці пакупнікоў на нерухомасць, якая не выкарыстоўваецца, у Ельскім раёне. **Сяргей МАТУЗКА, старшыня Ельскага раённага Савета дэпутатаў**, гаворыць, што сельсаветы даюць фотаздымкі па кожным аб'екце. Але «ў глыбінку, ды яшчэ да мяжы з Украінай, ніхто не паедзе». Грошай на знос такіх будынкаў не выдзяляецца, хоць там і чарнобыльская зона. Прапаноўвалі на продаж насельніцтву нават за 1 базавую велічыню. Многае сышло ў прыватныя рукі. Апошнім часам у раёне развіваецца малы і сярэдні бізнес, асабліва ў дрэваапрацоўцы. Раней мэблевая фабрыка налічвала 400 чалавек. Зараз стварыліся тры малыя прадпрыемствы, а на фабрыцы засталося 160.

**Анжаліка ГОМАН, старшыня Краснапольскага раённага Савета дэпутатаў**, гаворыць, што для іх мясцовасці характэрна развіццё праектнай дзейнасці. З-за вялікага адтоку людзей мясцовыя ўлады стараюцца актыўна вырашаць пытанне самазанятасці. «Райсавет заняўся гэтым кірункам работы, каб уцягнуць людзей у развіццё асабістых падсобных гаспадарак».

**Старшыня Жабінкаўскага раённага Савета дэпутатаў Анатоль ШАЛТАНЮК** расказаў, што ў іх раёне пачалося будаўніцтва завода па вырабе дабавак да камбікармоў — гэта дадаткова 60 працоўных месцаў. Тыдзень таму пачалі будаваць краму ў Жабінцы — гэта яшчэ 40. Прадпрыемства робіць цэнтр па лагістыцы і здачы тэхнікі ў арэнду — гэта 20 месцаў. Работа вядзецца.

Аляксандр Папкоў падкрэсліў, што ў кожным раёне ёсць традыцыі, якія былі і з'яўляюцца запатрабаванымі. «Мы павінны абудзіць ініцыятыву людзей». І задача кіраўнікоў раённых Саветаў дэпутатаў гэтаму спрыяць.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

# ЯК ПРАДАЦЬ, КАБ НЕ ПРАГАДАЦЬ?

## Квадратныя метры ваенных гарадкоў...

**Начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі гарвыканкама Сяргей ЛУШЧЫК** агучыў і такую лічбу: за мінулы год у бюджэт горада паступіла больш чым 4 млн рублёў ад розных аперацый з маёмасцю. Маецца на ўвазе найперш продаж і арэнда. На сённяшні дзень 59,7 тысячы квадратных метраў гарадской маёмасці не выкарыстоўваецца. Адсюль і вынікаюць задачы на найбліжэйшую перспектыву.

> Распараджацца маёмасцю на тэрыторыі крэпасці надзвычай складана па зразумелых прычынах — гэта асаблівае месца. Ды і па іншых ваенных гарадках ёсць праблемы

Цікава, што больш за палову ўсёй маёмасці, што не выкарыстоўваецца, складаюць аб'екты былых ваенных гарадкоў. Гэта 84 будынкі. Найбольшая іх колькасць размешчана на тэрыторыі чатырох былых ваенных гарадкоў: «Паўднёвы», «Чырвоны Двор», «Крэпасць» і па вуліцы Лейтэнанта Рабцава. Напрыклад, у ваенным гарадку №1 «Крэпасць» значыцца 24 аб'екты. З іх 23 маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. І толькі два з названых аб'ектаў зараз уцягнутыя ў гаспадарчы абарот. Адна пабудова здадзеная ў арэнду, другая перададзеная ў бязвыплатнае карыстанне. А ў былым памяшканні 125-га стралковага палка на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці вядзецца рэканструкцыя. Там будзе Маладзёжны патрыятычны цэнтр.

Распараджацца маёмасцю на тэрыторыі крэпасці надзвычай складана па зразумелых прычынах — гэта асаблівае месца. Ды і па іншых ваенных гарадках ёсць праблемы, бо іх тэрыторыі ў адпаведнасці з Генеральным планам развіцця Брэста павінны ператварыцца ў медыцынскія цэнтры, жылыя комплексы, іншыя важныя для жыцця горада аб'екты. Але гэта справа не вельмі блізкай перспектывы. Таму і застаюцца пытанні, як з арэндай, так і з рэалізацыяй.

## Трымаем планку

На пасяджэнні гарвыканкама звярнулі ўвагу на зніжэнне пакупніцкай здольнасці і дзелавой актыўнасці патэнцыяльных пакупнікоў нерухомасці. Так, з 16 аб'ектаў, якія былі прададзены летась, пяць рэалізавана з удзелам у таргах толькі аднаго прэтэндэнта, а шэсць знайшлі новых гаспадароў пасля таго, як першапачатковая цана была зніжана на суму ад 20 да 80 працэнтаў. Добра гэта ці дрэнна? **Старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** выказаў заклапочанасць тым, каб у пагоні за паказчыкамі не задаваць надта нізкую планку: «Дзеля паказчыкаў прадаць можна вельмі многа, але гэта будзе не па-дзяржаўнаму». Мэр заклікаў падначаленых усебакова пралічваць перспектыву. Скажам, на першы погляд, пабудова не вельмі новая, не вельмі каштоўная, і прадаць яе можна не дорага. А вось калі зазірнеш у генплан развіцця горада, то ўпэўнішся, што гэты лапік зямлі ў будучым стане ледзь не «залатым». Таму часам варта ўстрымацца ад здзелкі, каб элементарна не прагадаць.

> Па ўмовах продажу пакупнік можа пакінуць басейн, калі праўдзе рэканструкцыю, можа пераабсталяваць пад нешта іншае, а можа наогул знесці і пабудаваць нешта сваё.

**Начальнік КУП «ЖРЭУ г. Брэста» Павел ЗАГРАЙ** расказаў, што работа па зносе будынкаў, непрыгодных для выкарыстання, надзвычай капіталаёмкая. Так, летась знос аднаго аб'екта з папярэднім вырабам праектнай дакументацыі пацягнуў на мільярд недэнамінаваных рублёў.

## Знесці нельга

Аказваецца, нават у абласным цэнтры ёсць праблемы з тым, каб знесці трухлявае, па сутнасці нічыйнае жыллё. Пра жылы дом у раёне вуліцы Сікорскага таксама згадвалі на пасяджэнні выканкама. Правільней сказаць, былы жылы дом. За дзясяткі гадоў запусцення пабудова ператварылася ў руіны, якія зарастаюць хмызняком. І выглядам сваім такая сядзіба, вядома, псуе гарадскі пейзаж. Двое з трох нашчадкаў былых гаспадароў дома пражываюць у Расіі. Спроба стасункаў з імі нічога не дала. Суседзі не раз указвалі гарадской уладзе на такі непарадак далёка не на гарадской ускраіне. Ва ўмовах сельскай мясцовасці па Указе №100 даўно можна было б разабрацца з развалінамі. У горадзе дакумент не дзейнічае. Таму проста ўзяць і знесці трухлявую пабудову немагчыма. Спадкаемцы адразу аб'явяцца і заявяць іск з усімі наступствамі. Што застаецца? Хадзіць зноў і зноў, пісаць прадпісанні, складаць пратаколы без усялякай гарантыі, што апошняе неяк падштурхне ўласнікаў разабрацца з праблемнай нерухомасцю. На гэту акалічнасць члены выканкама звярнулі ўвагу дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ад горада Брэста, якія прысутнічалі на пасяджэнні. Варта прымаць папраўкі ў заканадаўства.

*Эфектыўнае выкарыстанне аб'ектаў уласнасці горада — гэта вельмі вялікі пласт работы. Акрамя традыцыйных продажу, арэнды, зносу аварыйных і старых пабудоў, даводзіцца рабіць шмат іншага. Нават калі пабудову ўдалося прадаць, гэта не заўсёды азначае другое яе жыццё. За апошнія гады гарвыканкаму даводзілася забіраць аб'екты зноў, бо новы гаспадар не выконваў абавязацельстваў, а дакладней, нічога не рабіў з пакупкай. Здаралася, іх прадавалі па трэцім разе. Ёсць прыклады іншага кшталту: летась па факце знішчэння капітальнай пабудовы была нават заведзена крымінальная справа... Такім чынам жыццё дыктуе меры, якія даводзіцца прымаць у дачыненні да таго ці іншага аб'екта.*

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

# ЭКАНАМІЧНАЯ БЯСПЕКА ПЕРШ ЗА ЎСЁ

**Дэпутаты Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі не выпадкова выбралі для выязнога пасяджэння «Магілёўхімвалакно». Летась прадпрыемства наведваў Прэзідэнт краіны і азнаёміўся з перспектывамі яго развіцця. Па сутнасці, да 2020 года тут павінна з'явіцца новая сучасная вытворчасць, якая будзе выпускаць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю. Вопыт прадпрыемства плануецца выкарыстаць пры падрыхтоўцы канцэпцый законаў «Аб электраэнергетыцы» і «Аб прамысловай палітыцы».**

## Хімічны гігант

Налета прадпрыемства адзначае паўстагоддзя сваёй дзейнасці. Калі гэты гігант толькі пачынаў працаваць, ён быў самым буйным у Еўропе, тут былі ўкаранёныя самыя перадавыя тэхналогіі вытворчасці поліэфірнай прадукцыі. Дзякуючы прадпрыемству насельніцтва Магілёва павялічылася больш чым удвая, горад моцна разросся, быў пабудаваны яшчэ адзін вялікі мост, які сёння носіць назву Шмітаўскі. Але перадавыя тэхналогіі, якія далі такі моцны імпульс для росту, састарэлі. Без мадэрнізацыі былы гігант не зможа на роўных канкурыраваць з іншымі вытворцамі, перш за ўсё кітайскімі.

Сёння на прадпрыемстве працуе каля 6 тысяч чалавек (раней было ў 4 разы больш). Заводскія плошчы ўражваюць. Груваcткія, аджыўшыя свой век будынкі кантрастуюць з новымі аўтаматызаванымі вытворчасцямі, дзе выпрацоўваюцца прадукты з высокай дабаўленай вартасцю — прэформы для піўной і малочнай тары, нятканыя матэрыялы, якія служаць асновай для лінолеума, прымяняюцца ў будаўніцтве. Абсталяванне працуе бесперапынна, за выключэннем таго часу, калі становіцца на тэхнічнае абслугоўванне. Аб тым, наколькі запатрабавана гэта прадукцыя, можна меркаваць па фурах, якія выстраіліся ў рад. Нумары — ад расійскіх і ўкраінскіх да сербскіх і польскіх.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Пётр САЛАЎЁЎ** гэта прадпрыемства ведае як самога сябе. Тут ён прайшоў працоўны шлях ад апаратчыка да галоўнага інжынера. З гонарам адзначае, што сістэма прамысловай бяспекі тут на ўзорным узроўні.

— Тут знаходзіцца каля 600 аб'ектаў, якія падпадаюць пад дзеянне закона аб прамысловай бяспецы, пачынаючы ад сасудаў, што працуюць пад ціскам, заканчваючы ліфтамі, грузапад'ёмнымі механізмамі, катламі пад ціскам і газаправодамі, — кажа ён. — І каб гэта гаспадарка працавала пад кантролем, тут створана спецыяльная лабараторыя, якая адсочвае надзейнасць усяго гэтага. Такое ёсць не ўсюды.

**Трэба развіваць прыкладную навуку, адаптаваць фундаментальныя навуковыя распрацоўкі да канкрэтнай вытворчасці. Каб маладыя спецыялісты прыходзілі на вытворчасць ужо падрыхтаванымі.**

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вольга ПАЛІТЫКА**, адзіная, дарэчы, у дэпутацкай камандзе жанчына, раней працавала на знакамітым прадпрыемстве «Атлант», але вось ужо другое скліканне займаецца заканатворчай дзейнасцю. І ёй было вельмі цікава паглядзець, як на практыцы рэалізуюцца нормы закона аб прамысловай бяспецы, адказнай за распрацоўку якога яна была.

— Менавіта прадстаўнікі хімічнай галіны ўнеслі шмат прапаноў і заўваг па законапраекце, — кажа яна. — Зараз я змагла пабачыць, як яны выконваюцца на практыцы, ці ўсё ўлічана, ці ўсё даказала сваю эфектыўнасць. Было прыемна пачуць, што новая рэдакцыя закона, не зніжаючы патрабаванні па прамысловай бяспецы, дазволіла прадпрыемству тры небяспечныя вытворчыя аб'екты першага тыпу перавесці ў другі. А гэта істотная эканомія сродкаў на страхавыя ўзносы. Наогул, уражанні ад прадпрыемства станоўчыя. Яно бачыць перспектыву, ведае, якія нішы на рынку будзе займаць. Захапляе і настрой работнікаў, аптымізм, з якім яны гэта расказваюць.


Фота БЕЛТА.

## Вытворчасць будучага

Па кітайскіх мерках, гэта маленькае прадпрыемства. Той жа поліэтыленцэрэфталат або палімер кітайцы выпускаюць мільёнамі тон у год, у той час як «Магілёўхімвалакно» ўсяго толькі дзясяткамі тысяч. Гэта адразу ж адбіваецца на сабекошце. Але гэта пакуль. Мадэрнізацыя дасць магчымасць заняць прадпрыемству больш моцныя пазіцыі. Агульны кошт першага этапу ацэньваецца ў 45,1 мільёна еўра. Усяго іх плануецца два. У выніку пераўтварэнняў «Магілёўхімвалакно» да 2020 года цалкам адыдзе ад затратных тэхналогій і будзе вырабляць тую прадукцыю, якая запатрабавана на рынках.

**Генеральны дырэктар прадпрыемства Пётр РУДНІК** звярнуў увагу на найбольш балючыя моманты. Той жа газ, які спажывае прадпрыемства, абыходзіцца яму ў 284 долары за тысячу кубоў. Прадпрыемства звярталася з просьбай знізіць на час мадэрнізацыі кошт да 204, як для ЦЭЦ, але яму было адмоўлена. Кіраўнік лічыць, што з такімі тарыфамі вельмі складана канкурыраваць на замежных рынках, асабліва ў Расіі, дзе газ у разы таннейшы. Былі і іншыя заўвагі. Напрыклад, яны датычыліся кадраў. Трэба развіваць прыкладную навуку, адаптаваць фундаментальныя навуковыя распрацоўкі да канкрэтнай вытворчасці. Каб маладыя спецыялісты прыходзілі на вытворчасць ужо падрыхтаванымі.

— Мы ўсе выйшлі з прамысловасці, сітуацыю, як той казаў, ведаем знутры, але тут падмацаваліся новымі аргументамі, — падвёў вынікі работы выязнога пасяджэння **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Андрэй РЫБАК.** — Важна, што прадпрыемства, якое перажыло няпростыя часы, упэўнена глядзіць у будучыню. Такія вытворчасці трэба падтрымліваць заканадаўча. Але дзяржава павінна заахвочваць толькі тых, хто адчувае рынак, ведае, як будзе развівацца галіна... Наогул, знаёмства з прадпрыемствам «Магілёўхімвалакно» было карысным. Закон аб прамысловай бяспецы прыняты ў 2015 годзе. Было цікава ўбачыць, што з гэтага ўжо не працуе. Паглядзім на адным прадпрыемстве, на другім і зробім высновы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

БЕЗ ДАТАЦЫЙ

# ПАВЯЛІЧВАЕМ ДАХОДЫ

## Дэпутаты абмеркавалі фарміраванне мясцовых бюджэтаў

**На мінулым тыдні Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па бюджэце і фінансах правяла выязное пасяджэнне ў Лагойскім раёне. Сёння ён — адзін з найлепшых па эканамічных паказчыках. Адно з пацвярджэнняў гэтага: у раёне апошнім часам фарміруецца бездатацыйны бюджэт.**

Лагойск мае станоўчы вопыт у арганізацыі бюджэту, таму было прынята рашэнне правесці пасяджэнне менавіта тут. «Сёння фарміраванне даходаў мясцовых бюджэтаў напрамую залежыць ад развіцця рэгіёна, — тлумачыць **Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па бюджэце і фінансах.** — Калі, напрыклад, Лагойскі раён паспяхова развіваецца, адпаведна і напаўняльнасць даходнай часткі бюджэту добрая. Самае галоўнае, што тут пачалі фарміраваць бездатацыйны бюджэт. Мы бачым, што ў раёне сёння дынамічна працуюць суб'екты гаспадарання, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Практычна няма ніводнага, якое б мела страты. Таму і фарміраванне бюджэту адбываецца больш паспяхова ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі».

Асабліва дэпутаты звярнулі ўвагу на рэзервы фарміравання даходнай часткі мясцовых бюджэтаў, якія заключаюцца ў павелічэнні паступленняў ад малога і сярэдняга бізнесу. Людміла Дабрыніна лічыць, што пры падрыхтоўцы законапраектаў на 2018 год — менавіта бюджэтнага пакета і ў тым ліку праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце — улічыць гэтыя пытанні і сумесна іх яшчэ раз абмеркаваць, асабліва падыходы па адміністраванні мясцовых падаткаў і збораў. Што да выканання расходнай часткі мясцовых бюджэтаў, то тут неабходна паступова павялічваць выдаткі капітальнага характару. Гэта дазволіць больш эфектыўна добраўпарадкоўваць раён.

У пасяджэнні таксама ўзяў удзел **намеснік міністра фінансаў Юрый СЕЛІВЕРСТАЎ.** Па яго словах, бюджэты базавага ўзроўню іграюць важную ролю ў рэалізацыі дзяржаўных функцый. Менавіта за кошт іх органы дзяржкіравання забяспечваюць прадастаўленне асноўных сацыяльных паслуг у галіне адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, транспарту. Так, штогод выдаткі мясцовых бюджэтаў у сярэднім захоўваюцца на ўзроўні 16% ВУП і займаюць больш за палову кансалідаванага бюджэту краіны.

Намеснік міністра дадаў, што на практыцы рэалізаваны шэраг мер, якія накіраваны на ўмацаванне рэсурснай базы мясцовых бюджэтаў і зніжэнне іх залежнасці ад датацый вышэйстаячых бюджэтаў. Так, мясцовыя бюджэты ў сярэднім на 70% фарміруюцца за кошт падатковых паступленняў. За імі замацаваны такія крыніцы даходаў, як падаходны падатак і падаткі на ўласнасць. Менавіта таму мясцовыя ўлады зацікаўлены ў павелічэнні аплаты працы ў рэгіёне, а таксама ў стварэнні і развіцці вытворчых магутнасцяў на падведамасных прадпрыемствах.

Юрый Селіверстаў нагадаў аб павышэнні ў 2015 годзе ставкі падаходнага падатку (да 13%), які выплачваецца ў мясцовыя бюджэты. Акрамя таго, мясцовым Саветам дэпутатаў прадастаўлена права павышаць базавыя стаўкі зямельнага падатку і падатку на нерухомасць да 2,5 раза. У кампетэнцыі мясцовых улад таксама ўстанаўленне ставак падатку на прыбытак. Тым самым рэгіёны матывуюцца да павышэння эфектыўнасці дзеючых прадпрыемстваў, да стварэння новага бізнесу, новых працоўных месцаў.

Аднак развіццё мясцовага падаткаабкладання застаецца актуальным пытаннем. Для стымулявання мясцовых Саветаў дэпутатаў неабходна, каб імі магла рэгулявацца, напрыклад, велічыня ставак збору за ажыццяўленне паслуг аграэкатурызму (па аналогіі з курортным зборам). Яшчэ адна магчымасць — гэтаксама абыходзіцца са зборам за ажыццяўленне рамесніцкай дзейнасці. Таксама ў перспектыве магчыма пашырыць паўнамоцтвы мясцовых Саветаў у дачыненні да падаткаў на нерухомасць. «Пры гэтым неабходна, каб такія рашэнні прымаліся з улікам інтарэсаў насельніцтва і бізнесу», — падкрэсліў Юрый Селіверстаў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*
*г. Лагойск.*

# АДНА СУПРАЦЬ УСІХ?

## Чаму жыхарка аграгарадка не згодна з рашэннем мясцовай улады

**Кожны сельскі жыхар хоча бачыць сваю вёску добраўпарадкаванай. Але жаданні людзей не заўсёды супадаюць з планамі мясцовай улады. Жыхарка аграгарадка Хатляны Уздзенскага раёна ўжо не першы год спрабуе спыніць незаконнае, на яе думку, будаўніцтва жылых дамоў. Сельвыканкам жа сцвярджае, што прэтэнзіі грамадзянкі не маюць падстаў. Каб разабрацца ў сітуацыі і выслухаць пазіцыі бакоў, у Хатляны выехаў карэспандэнт «МС».**

### СПРЭЧНАЯ ПЛЯЦОЎКА

Хатляны — невялікі аграгарадок за 30 хвілін язды ад сталіцы. З 1988 года тут жыве **Тацццяна СУХАРЭВІЧ**, якая апошнім часам нарабіла нямала шуму ў ціхім мястэчку. Мясцовая жыхарка ўжо некалькі гадоў змагаецца за пляцоўку, на якой, паводле яе слоў, нельга нічога будаваць.



— Усё пачалося ў 2014 годзе, калі старшыня сельскага Савета Тамара Ляснеўская прапанавала насельніцтву на той пляцоўцы тры ўчасткі пад забудову жылых дамоў, — расказвае Таццяна Васілеўна. — Участкі хутка знайшлі сваіх уладальнікаў, аднак я перакананая, што будаваць там нельга нічога.

Сама пляцоўка ўяўляе сабой вялікі круг у адным з найбольш высокіх месцаў аграгарадка. Асаблівасць заключаецца ў тым, што па яго дузе пад зямлёй размяшчаюцца водаправодныя калодзежы, якія забяспечваюць вадой найбліжэйшыя вуліцы. Па перыметры круга ўжо даўно збудаваны дамы.

Жанчына паказвае вялікі план пасёлка, датаваны 1990 годам. «Гэта не план аграгарадка Хатляны. Адбылася блытаніна: гэта генеральны план, які адносіцца да свінагадоўчага комплексу «Белая Русь» (асноўнае прадпрыемства Хатлян), а на Хатляны схемы развіцця няма», — падкрэслівае Таццяна Васілеўна. Але, на думку жанчыны, менавіта гэты план варта браць за аснову развіцця пасёлка. Дарэчы, паводле яго ў цэнтры спрэчнага ўчастка планавалі пабудаваць царкву. Аднак у аграгарадку адвялі іншую, таму яшчэ адну ўзводзіць не прыйшлося.

Калі пасёлак пачалі забудоўваць, унутры круга была пустка. Таццяна Сухарэвіч успамінае, што ў 90-я гады яе выкарыстоўвалі як кар'ер: спецыяльныя машыны здабывалі там пясок для будоўлі. Паступова пляцоўка стала ператварацца ў велізарны сметнік — і не толькі з будаўнічых матэрыялаў. Намаганнямі жанчыны і яе мужа кар'ер быў закрыты, участак разраўнялі, але... усё смецце засталося пад зямлёй. «Уяўляеце, як новая забудова можа паўплываць на водаправодныя калодзежы, якія знаходзяцца зусім побач?» — гаворыць Таццяна Васілеўна.

Мясцовыя жыхары пасадзілі на пляцоўцы дрэвы, каб яна не пуставала. Таццяна Васілеўна лічыла, што ў гэтым месцы можна было б зрабіць выдатны парк. Але шчасце было нядоўгім: перад пачаткам забудовы прыйшлося ўсе дрэвы спілаваць.

Сёння на гэтых участках ужо заліты тры падмуркі, але жанчына і надалей збіраецца выступаць супраць будаўніцтва.

### ПАЗІЦЫЯ СЕЛЬСАВЕТА

**Старшыня Хатлянскага сельскага Савета Тамара ЛЯСНЕЎСКАЯ** паказвае стос папер, «прысвечаных» участку для забудовы. Агульны генеральны план на Хатляны сярод усіх дакументаў адсутнічае.

— Генплана ў нас няма, — адзначае Тамара Ляснеўская. — Зараз усё растлумачу: у 1986 годзе было прынята рашэнне, звязанае з будаўніцтвам свінагадоўчага комплексу, — стварыць жылы пасёлак для работнікаў гэтага прадпрыемства. Распрацавалі генеральны план, у які ўваходзілі дзве вуліцы — Цэнтральная і Першая. На ім таксама нанеслі гандлёвы цэнтр і дзіцячы сад.



Такія звесткі ў старшыні ёсць з той прычыны, што ў тыя гады яна працавала ў будаўнічай арганізацыі, якая ўзводзіла свінагадоўчы комплекс. «Я сама бачыла праектную дакументацыю», — дадала Тамара Іосіфаўна.

— Генплан, пра які я расказваю, не прадугледжваў больш ніякіх пабудоў, — падкрэсліла старшыня. — Усё астатняе было вылучана праектнай дакументацыяй дэталёвай планіроўкі індывідуальных забудоў па кожнай вуліцы, — і яны ўсе выраблялiся асобнымі ўчасткамі. Для ўчастка, пра які вядзе размову Таццяна Сухарэвіч, рабіўся сітуацыйны план як ушчыльненне існуючай забудовы.

Каб участак прапанавалі пад будаўніцтва людзям, неабходна прайсці шэраг працэдур. «Па-першае, трэба ўзгадненне з усімі службамі раёна. Потым пытанне ўздымаецца на пасяджэнні райвыканкама. Пасля гэтага мы інфармуем грамадзян, што ў нас, на тэрыторыі сельсавета, маюцца тры свабодныя ўчасткі, унесеныя ў пералік, які ёсць на сайце і на стэндзе інфармацыі... І насельніцтва — а гэта былі маладыя сем'і — да нас звярнулася», — дадала старшыня. У сучасных вёсках сёння не так шмат моладзі, таму кожная маладая сям'я дапамагае развіццю аграгарадкоў. Дарэчы, стан уладальнікаў гэтых участкаў, па словах Тамары Ляснеўскай, сёння не самы лепшы, бо пастаянныя праверкі не даюць ім спакойна весці будаўніцтва.

Што датычыцца ўплыву пабудоў на гэтым участку на экалагічны стан усяго аграгарадка (пра што папярэджвае Таццяна Сухарэвіч), то тут старшыня таксама кіруецца дакументамі спецыяльных службаў. «У нас ёсць адказ з санстанцыі, дзе пацвярджаецца, што ніякай шкоды ні для каго не будзе, бо выкананы ўсе санітарныя нормы і правілы», — падкрэсліла Тамара Іосіфаўна.

Гісторыя аб існаванні звалкі на згаданай пляцоўцы таксама не абгрунтавана, лічыць Ляснеўская. «У тыя часы пасёлак будаваўся. Магчыма, там і адбывалася складаванне будаўнічых матэрыялаў, — адзначыла старшыня. — Я гаварыла з мясцовымі жыхарамі з той вуліцы. Магчыма, быў невялікі кар'ер, з якога забіраўся пясок. Але па заканчэнні будаўніцтва ўсё прыбралі. Ніякай звалкі насельніцтва не памятае, і я не ведаю, адкуль Таццяна Васілеўна ўзяла такую інфармацыю».

— Калі яна працягне да нас звяртацца і адпраўляць адпаведныя паперы, то мы будзем ёй адказваць, — дадала Тамара Ляснеўская. — Але ўсе спецыяльныя службы ўжо некалькі разоў давалі дакладныя адказы: усё ў парадку, нормы не парушаныя. Уяўляеце, як адчуваюць сябе сем'і, якія атрымалі гэтыя ўчасткі? Афіцыйныя пастановы ёсць, але праверкі не спыняюцца, а будаўніцтва замаруджваецца...

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

**Рэдакцыя «МС» азнаёмілася з гісторыяй перапіскі Таццяны Сухарэвіч з дзяржаўнымі органамі. Жыхарка аграгарадка Хатляны не раз дасылала звароты ў інстанцыі абласнога ўзроўню. Але ў сваіх адказах яны... абапіраюцца выключна на звесткі, прадстаўленыя мясцовымі ўладамі, дзеянні якіх Таццяна Васілеўна і аспрэчвае. У выніку ўзнікае «замкнёнае кола», а перапіска зацягваецца на гады. Узнікае пытанне: чаму б у такім разе не стварыць незалежную камісію, якая б раз і назаўсёды паклала канец спрэчкам?**



| | |
|---|---|
| **ООО «Центр Белинвентаризация»**<br>**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** | ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком<br>✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения<br>✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения<br>✓ Оценка всех видов собственности |

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СВЕТЛОГОРСКОГО РАЙПО 8 (02342) 2 14 34**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение (здание неустановленного назначения) с инв. №342/С-168246, общей площадью – 204,0 кв. м (составные части и принадлежности: пристройка и тамбур кирпичные), расположенное по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, ул. Авиационная, 2А/4.<br>– Капитальное строение (здание неустановленного назначения) с инв. №342/С-168266, общей площадью – 18,8 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, ул. Авиационная, 2А/8.<br>– Капитальное строение (здание неустановленного назначения) с инв. №342/С-168268, общей площадью – 281,8 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, ул. Авиационная, 2А/5.<br>Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 325050100001002589 площадью 0,7956 га | **180 000,00** | **18 000,00** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 14 апреля 2017 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **18 апреля 2017г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266.<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация».<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 05.04.2017 г. |
| **Условия продажи** | Объекты продаются в собственность.<br>Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона.<br>Срок оплаты: определяется по согласованию с собственником имущества при заключении договора купли-продажи.<br>Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.<br>Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 01.03.2017 г. |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

## КЛЕЦКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ИЗВЕЩАЕТ

### О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРЕДОСТАВЛЕНИЮ ПОВЕРХНОСТНОГО ВОДНОГО ОБЪЕКТА В АРЕНДУ ДЛЯ РЫБОВОДСТВА

| | |
|---|---|
| **Наименование** | Поверхностные водные объекты – Пруд у агрогородка Головачи |
| **Экологический статус** | Пруд у агрогородка Головачи в гидрографическом отношении относится к системе реки Лань, бассейн реки Припять. Пруд образован в 1970 году на р. Коник, является левым притоком реки Лань, относится к искусственным водоемам руслового типа.<br>Полный объем водной массы составляет 254,9 тыс. м³. Имеет сложную форму и состоит из трех заливов. По осевой линии северного и восточного заливов длина пруда составляет 1,55 км. Пруд вытянут с севера на юг и затем на восток, максимальная ширина 0,28 км (средняя 0,13 км). Длина береговой линии 4,1 км, имеет довольно извилистые очертания.<br>Согласно общепринятой классификации пруд относится к мелководным водоемам, максимальная глубина достигает 5,0 м, средняя 1,2 м, максимальные глубины смещены к приплотинной части пруда.<br>Котловина пруда образована в русловой и пойменной частях реки Коник. С северной части пруд огражден земляной дамбой с бетонированными откосами. Высота бьефа составляет 3,5 м. Склоны подводной части котловины пруда слабо выражены. Дно пруда преимущественно плоское, заилено. Для пруда характерен гидрологический режим малых водохранилищ с замедленным водообменом |
| **Общая площадь** | 21,56 га |
| **Месторасположение объекта** | В Клецком районе Минской области, на восточной окраине агрогородка Головачи |
| **Срок аренды** | 5 лет |
| **Начальная цена объекта аукциона** | 3471 руб. 16 коп. |
| **Сумма задатка** | 694 руб. 23 коп. |

Аукцион состоится **11 мая 2017** года в 11.00 **по адресу:** Минская область, г. Клецк, пл. Маяковского, 10, зал заседаний (4-й этаж).
Аукцион проводится на основании положения о порядке проведения торгов по предоставлению поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 15 октября 2015 г. №861 «Об утверждении Положения о порядке проведения торгов по предоставлению поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства».
Водный объект предоставляется в аренду для товарного рыбоводства и рыбоводства в рекреационных целях.
Для участия в аукционе юридическое или физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием сведений о поверхностном водном объекте, которые участник торгов желает получить в аренду по результатам аукциона.
К заявлению прилагаются:
- копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка в сумме 20% от начальной цены.
Сумма задатка вносится до 13.00 10 мая 2017 года на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области № 3600616000702, ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001795, УНП 600537220, код платежа 04004.
- доверенность представителя участника аукциона и копия документа, подтверждающего его личность, в случае, если заявление подписывается не участником аукциона;
- копии учредительных документов и копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица;
- копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя;
- копия паспорта гражданина.
Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи: каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по тел. 8 01793) 68232 либо по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, каб. 312.
Условием проведения аукциона является наличие не менее двух участников.
Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.
Шаг аукциона к начальной цене поверхностного водного объекта составляет 5%.
В случае если при проведении торгов в виде аукциона они признаны несостоявшимися в силу того, что заявление подал только один участник или для участия в нем явился только один участник, договор аренды поверхностных водных объектов заключается с этим участником при его согласии по начальной цене ежегодной арендной платы, увеличенной на 5 процентов.
Решение комиссии по результатам аукциона оформляется протоколом.
Протокол подписывается председателем и членами комиссии в день проведения аукциона.
Участники торгов должны быть ознакомлены с протоколом аукциона в течение пяти рабочих дней после его проведения.
Участникам аукциона, не выигравшим аукцион, задаток должен быть возвращен в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.
Участнику, выигравшему аукцион, сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключаемому по результатам аукциона.
Клецкий районный исполнительный комитет (далее райисполком), вправе отказаться от его проведения в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.
В случае отказа от проведения аукциона райисполкомом, проводящим аукцион, задаток участникам должен быть возвращен в течение пяти дней после объявления райисполкомом об отказе от проведения аукциона.
Возмещение затрат райисполкому на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с разработкой и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, осуществляется участником аукциона, выигравшим аукцион, в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области №3600616000702, ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001795, УНП 600537220, код платежа 04616.
Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения в обязательном порядке доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.
Принятие решения о предоставлении поверхностного водного объекта для рыбоводства, заключение договора аренды производится в соответствии с пунктами 11 и 15 Положения о порядке предоставления поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 25 апреля 2015 г. №333.
Документы для участия в аукционе принимаются в рабочие дни в Клецком райисполкоме по адресу: 222531, Минская область, г. Клецк, пл. Маяковского, 10, кабинет №312, контактный телефон 8 (01793) 68232. Окончательный срок приема документов – 10 мая 2017 г. до 13.00.

## ОАО «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ»,

расположенное по адресу: г. Минск, пер. Чайковского, 3, сообщает о принятом решении очередным общим собранием акционеров **30 марта 2017 г.** о начислении и выплате дивидендов по простым (обыкновенным) акциям по итогам работы за 2016 год.

Размер начисления дивидендов на одну акцию – 0,12 рубля.

Срок выплаты – в части, приходящейся на долю государственной собственности до 22 апреля 2017 г., в части, приходящейся на долю остальных акционеров со 2 мая 2017 г. по 31 мая 2017 г. путем перечисления на счет акционера в банке, в случае отсутствия счета – высылаются почтовым переводом.

Справки по телефонам: (8-017) 285 70 53, 285 61 66.

Наблюдательный совет.
УНП 100347020

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

# КАЛІ ШУКАЕШ — ЗНОЙДЗЕШ

**«На перыферыі няма чаго рабіць!» — гэтае меркаванне чуецца даволі часта. І многія маладыя кіруюцца ў вялікія гарады ў пошуках лепшай долі. Але знаходзяцца і тыя, хто даказвае адваротнае: быць паспяховым можна і ў райцэнтры. Сужэнцы Станіслаў і Ганна Сяргеевы ўжо два гады займаюцца малым прадпрымальніцтвам у Добрушы. Пакуль уласная справа прыносіць не столькі прыбытку, колькі клопату. Але маладыя людзі не апускаюць рукі. У размове з карэспандэнтам «МС» яны расказалі пра свой вопыт вядзення бізнесу ў невялікім горадзе.**



## Сам сабе гаспадар

Перш чым адкрыць уласную справу, Станіслаў змяніў некалькі заняткаў. Працаваў прадаўцом бытавой тэхнікі, гандляваў аўтазапчасткамі, займаўся раскруткай сайтаў. Пасля вырашыў аформіць прадпрымальніцтва. «На той момант ніводзін з варыянтаў працаўладкавання мяне не задавальняў, — расказвае малады чалавек. — А пакідаць родны горад не хацелася. Уласны бізнес вабіў яшчэ і тым, што над табой няма начальнікаў. Ты сам сабе гаспадар. Ёсць, праўда, у гэтым і адваротны бок: калі нешта не ладзіцца, няма каго вінаваціць».

Што трэба, каб распачаць уласны бізнес? «Грошы», — адкажа большасць людзей. Так, без іх нікуды. Але і важна разумець, чым менавіта займацца. «Даволі складана ўлезці ў даўно занятыя нішы. Лепей азірнуцца навокал, прыглядзецца і пашукаць тое, чаго ў вашым горадзе нестае». На той момант у Добрушы не было офіса аднаго з беларускіх мабільных аператараў. І маладая пара вырашыла, што найлепшы варыянт для пачаткоўцаў — працаваць па франшызе. Гэта значыць, скласці пагадненне з ужо вядомым брэндам і дзейнічаць ад яго імя.

«Гэта зручна з некалькіх прычын, — разважае Станіслаў. — Па-першае, табе даюць гатовы брэндбук — распрацаваныя лагатыпы, прома-прадукцыю і інш. Па-другое, мабільныя тэлефоны — наш асноўны тавар — не трэба закупляць: кампанія дае іх на рэалізацыю. Калі тэлефон набылі — ты разлічваешся з пастаўшчыком. Калі ж апарат заляжаўся — у цябе яго адзываюць». Перавага такой схемы відавочная: прадпрымальніку не трэба мець велізарных абаротных сродкаў для куплі тавару. І адпаведна няма праблемы са збытам непапулярных мадэляў тэлефонаў.

## Дзе грошы ўзяць?

Пачатковы капітал — рэч неабходная. Але адкуль яго ўзяць? «Мне часта задаюць гэтае пытанне, — кажа Станіслаў. — І я не ведаю, што параіць. Асабіста я здолеў зрабіць пэўныя зберажэнні, калі яшчэ быў наёмным работнікам. Тут важна паставіць канкрэтную мэту і шукаць спосабы яе дасягнення, а не проста марыць, лежачы на канапе».

А выдаткаў у прадпрымальніка-пачаткоўца будзе нямала. Ад аплаты пошлін за рэгістрацыю да арэнды памяшкання і набыцця тавару або абсталявання. Даводзіцца плаціць нават за тое, што на будынку вісіць шыльда з назвай тваёй крамы. Ужо не кажучы пра непрадбачаныя расходы. Таму без пэўнай сумы грошай кідацца ў вір рынкавых адносін проста няма сэнсу. Канкрэтныя ж лічбы залежаць ад абранай вамі сферы.

## Плюсы і мінусы арэнды

Знайсці адпаведнае памяшканне прадпрымальніку-пачаткоўцу складана. Праблема не ў адсутнасці месца, а ў тым, што кошт арэнды не заўсёды адпавядае якасці плошчаў. І дагледжанае памяшканне дзе-небудзь у абласным цэнтры або сталіцы часам абыходзіцца танней, чым занядбанае на перыферыі. А некаторыя ўласнікі проста адмаўляюцца здаць у арэнду «квадраты», якія пустуюць гадамі. Што дзіўна ў наш час, калі і Прэзідэнт, і ўрад прымаюць захады, каб паспрыяць развіццю малога бізнесу. Дый пустыя плошчы вісяць на балансе мёртвым грузам і не прыносяць прыбытку. А кожны кіраўнік мусіць быць зацікаўлены ў максімальна эфектыўным выкарыстанні маёмасці свайго прадпрыемства.

Станіславу на пошук памяшкання таксама спатрэбілася нямала часу. Справа ўскладнялася тым, што ў кампаніі, з якой супрацоўнічае прадпрымальнік, даволі строгія патрабаванні да крамы-офіса. Урэшце знайшлося памяшканне памерам усяго ў 11 квадратных метраў. Але гэтага было досыць, каб уладкаваць працоўнае месца і выставіць стэнд з тэлефонамі і аксесуарамі. «Вядома, лепей за ўсё мець уласнае памяшканне, — разважае Станіслаў. — І ў нас у раёне ладзяцца аўкцыёны, дзе прадаюць нерухомасць, што не выкарыстоўваецца. Але кожны прадпрымальнік-пачатковец можа адразу дастаць з кішэні, скажам, сорак тысяч рублёў. Адолець такую суму лягчэй тым, у каго ўжо ёсць некалькі крамаў і, адпаведна, большы абарот. А маймў бізнесу ўсяго два гады. Таму арэнда пакуль — аптымальны варыянт».

## Не кладзі яйкі ў адзін кошык

Невялікія нацэнкі пры вялікіх абаротах — паводле такога прынцыпу працуе сучасны бізнес. Гэта актуальна не толькі для буйных гандлёвых сетак, але і для індывідуальных прадпрымальнікаў. Больш-менш умацаваўшыся ў адной нішы, многія асвойваюць новыя кірункі бізнесу. Станіслаў не толькі прадае тэлефоны і аксесуары, але і прымае ў рамонт сапсаваныя апараты. «Мы склалі дагаворы з майстэрнямі, — расказвае прадпрымальнік, — і бяром сваю невялікую камісію за пасрэдніцкія паслугі. Але людзям гэта ўсё адно выгадней, чым везці зламаны тэлефон кудысьці ў Гомель».

З нядаўняга часу Станіслаў таксама гандлюе папулярнымі цяпер парагенератарамі і аксесуарамі да іх. Ідэю зноў падказала жыццё: сам малады чалавек са звычайных цыгарэт перайшоў на электронную прыладу. І сутыкнуўся з адсутнасцю ў Добрушы адпаведных расходных матэрыялаў: у прыватнасці, вадкасцяў для запраўкі. «Пакупнікоў пакуль небагата, — прызнаецца прадпрымальнік, — але сваё кола сталых спажыўцоў ужо склалася. Некаторыя мадэлі парагенератараў у нас «размяталі» за лічаныя гадзіны. Нават выставіць на вітрыну не паспявалі».

**А выдаткаў у прадпрымальніка-пачаткоўца будзе нямала. Ад аплаты пошлін за рэгістрацыю да арэнды памяшкання і набыцця тавару або абсталявання. Даводзіцца плаціць нават за тое, што на будынку вісіць шыльда.**

Задумваецца Станіслаў і над пашырэннем геаграфіі сваёй справы: нядаўна ездзіў «на разведку» ў Веткаўскі раён. Бо чым разнастайнейшы бізнес, тым лягчэй прадпрымальніку ўстаяць на нагах, калі адзін з кірункаў раптам становіцца нявыгадным. Просты прыклад: летась перад 8 Сакавіка па мабільныя тэлефоны стаялі чэргі, а сёлета напярэдадні свята Станіслаў прадаў толькі некалькі штук. Таму даўні прынцып «Не класці ўсе яйкі ў адзін кошык» цяпер актуальны, як ніколі.

## Муж і жонка — найлепшая суполка

Расказваючы пра свой бізнес, Станіслаў увесь час кажа «мы». І нездарма: яму ва ўсім дапамагае жонка. «Мы не дзелім справы на мужчынскія і жаночыя, — кажа Ганна Сяргеева. — У нас усё агульнае. І я па магчымасці дапамагаю Стасу весці бізнес. Бо аднаму цягнуць на сабе гэты «воз» надзвычай цяжка».

Сама Ганна працуе крэдытным агентам і мае стабільную зарплату. Гэта дапамагае сям'і перажываць складаныя перыяды, калі бізнес не прыносіць прыбытку або патрабуе грашовых укладанняў. «Нават калі мужчына галоўны здабытчык, гэта не значыць, што жонка павінна займацца выключна хатняй гаспадаркай, — лічыць дзяўчына. — Сямейнае жыццё — гэта перш за ўсё партнёрства і ўзаемная падтрымка».

Ганна дапамагае мужу не толькі ў арганізацыйных момантах, але і ў распрацоўцы бізнес-мадэлі. «Мы арыентуемся на ўсталяванне доўгатэрміновых адносін з пакупнікамі. Таму стараемся выставіць такую гандлёвую нацэнку, каб у нас тэлефоны каштавалі на 10—15 рублёў танней, чым у іншых гарадскіх крамах. Вядома, маем меншы прыбытак. Затое чалавек прыйдзе да нас зноў».

Малы бізнес — гэта не тая сфера, дзе можна хутка ўзбагаціцца. Працаваць даводзіцца доўга і ўпарта. «Муж з восені практычна не мае выхадных. Толькі на Новы год дазволіў сабе пару дзён адпачынку, — расказвае Ганна. — А мабільнік у яго не змаўкае ад рання і да змяркання. Не можам нават спакойна павячэраць: яму ўвесь час тэлефануюць па рабоце. Няма вольнай хвілінкі нават для хобі».

## Ад мінулага — у будучыню

Між тым сужэнцы маюць агульнае захапленне — гэта рэканструкцыя народных строяў, звычаяў і абрадаў. На адной з этнаграфічных вечарын маладыя людзі і пазнаёміліся. І сваё вяселле зладзілі паводле старадаўніх традыцый: госці маладых прыйшлі ў вышыванках, а на сталах быў сапраўдны крупнік. Але цяпер на ўдзел у этнаграфічных рэканструкцыях не хапае часу. «На жаль, Калядкі мы прапусцілі, — уздыхае Ганна, — але я ўжо сказала мужу: на Купалле паедзем у любым разе, што б там ні было з работай!»

**Знайсці адпаведнае памяшканне прадпрымальніку-пачаткоўцу складана. Праблема не ў адсутнасці месца, а ў тым, што кошт арэнды не заўсёды адпавядае якасці плошчаў.**

І ўсё ж бізнес для маладой пары застаецца галоўнай справай. Іх даўняя мара — самім наладзіць выраб бампераў і чахлоў для тэлефонаў. «Глядзіце, якая прыгажосць! — Ганна паказвае бампер з беларускай вышыванкай. — А зроблена ведаеце дзе? У Расіі! Хоць гэта не касмічныя тэхналогіі: можна і ў нас выпускаць нешта падобнае. А ў Стаса ёсць задумка купіць лінію для перапрацоўкі смецця. Каштуе яна тысяч пяцьдзясят долараў. Але гэтыя грошы яшчэ трэба зарабіць...»

Ганна глядзіць на гадзіннік: заканчваецца абедзенны перапынак. Дзяўчына спяшаецца на рабочае месца, а яе муж адпраўляецца па справах. І так дзень пры дні. Пакуль адны жаляцца на няспрыяльныя ўмовы, на бесперспектыўнасць працы на перыферыі, іншыя ўпарта працуюць на ўласную будучыню. І не чакаюць, што нехта нешта ім паднясе на «спадачку». І прыносяць сваёй працай карысць людзям.

**Валянцін БОЙКА.**
*boika@zviazda.by*

## Каментарый у тэму:

**Аляксандр ХАЗАЎ, начальнік аддзела эканомікі Добрушскага раённага выканаўчага камітэта:**

— У Добрушскім раёне прадпрымальніцкую дзейнасць ажыццяўляюць больш за 750 суб'ектаў малога бізнесу. Гэта як юрыдычныя асобы, так і індывідуальныя прадпрымальнікі. Сярод іх пераважаюць суб'екты гандлю. Апошнім часам пашыраецца асартымент тэхнічна складаных тавараў, будаўнічых матэрыялаў. Суб'екты бытавога абслугоўвання прапануюць пашараны спектр паслуг. Набыла развіццё дрэваапрацоўка і вытворчасць мэблі. Гэта паляпшае агульную якасць жыцця ў горадзе і раёне: тавары і паслугі становяцца больш даступнымі, знікае неабходнасць ехаць па іх у абласны цэнтр.

У 2016 годзе суб'ектамі малога бізнесу ў Добрушскім раёне прыцягнута ў гаспадарчы абарот больш за 20 аб'ектаў, што дагэтуль не выкарыстоўваліся або выкарыстоўваліся неэфектыўна. У тым ліку тры комплексы аб'ектаў нерухомасці былі прададзены ва ўстаноўленым парадку. З пачатку гэтага года ўжо рэалізавана два аб'екты, што не выкарыстоўваліся.

# ГАЛОЎНЫ ЧАЛАВЕК У ВЁСЦЫ




**Старэйшыны ў вёсках Віцебшчыны — галоўныя людзі. Займаючы адказную «пасаду», яны не атрымліваюць зарплату. Пры гэтым за якаснае выкананне сваіх абавязкаў маюць права на прэмію. Але ж толькі раз у квартал. Яны дапамагаюць мясцовай уладзе і па-добраму «лабіруюць» інтарэсы аднавяскоўцаў. Стараюцца, каб у вёсцы людзі ні ў чым не мелі патрэбы. Сярод старэйшын нямала вельмі ініцыятыўных людзей. З адной з іх пазнаёміўся наш карэспандэнт падчас камандзіроўкі ў Лёзненскі раён.**

## Багатая гісторыя

Спачатку пра назву. Мясцовы краязнавец Іван Ягоравіч Селібакін можа расказаць больш за 10 версій паходжання назвы населенага пункта. Гэты нераўнадушны і вельмі цікавы чалавек сам варты асобнага артыкула. Ён адзначае, што Уна ў ліку іншага мае сваю назву і ад таго, як падганяюць коней — «но». Ёсць «карані» назвы і ў старaславянскай мове, і ў малдаўскай... Вёску пасля адмены прыгоннага права засялілі латышы. У 1930-я каля дзвюх тысяч чалавек адсюль дэпартавалі. Між іншым, Уна — адзін з нямногіх населеных пунктаў, дзе былі аж два сельскія Саветы. І адзін з іх — латышскі. Мясцовая нацыянальная школа лічылася ўзорнай. Пра гэта можна прачытаць ва ўспамінах даваеннага часу.

Сёння ў вёсцы засталося крыху больш за 80 жыхароў.

## Гараджанка пераехала...

Навaспечаная старэйшына Марыя Паўлаўна ГУСЕВА з Віцебска пераехала жыць у вёску Уна. У гэтай адказнай ролі яна менш за два месяцы.

— Напэўна, гэта быў «покліч зямлі», бо нарадзілася я ў глыбінцы. Родам з Крупскага раёна Мінскай вобласці. Пасля вучобы ў Аршанскім чыгуначным тэхнікуме па размеркаванні паехала ў Казахстан. Кіравала рухам цягнікоў, — успамінае старэйшына.

З чыгункай звязана ўся яе працоўная біяграфія. Дзед быў пуцявым абходчыкам пад Масквой — на станцыі Кубінка. Муж працаваў машыністам грузавога цеплавоза. Адна з дзвюх дачок працуе на станцыі Віцебск... У няпростыя 1990-я, калі, мякка кажучы, прыярытэт аддаваўся мясцовым кадрам, Марыя Паўлаўна вярнулася ў Беларусь.

Менавіта ў Уне ў 2013 годзе купіла дом, каб стаць суседкай сяброўкі. Падчас размовы ўсё саромелася, што жыллё, на яе погляд, не ў ідэальным стане. Маўляў, падлогі наогул не было, так што не звяртайце ўвагі. Але ж у доме вельмі ўтульна.

— Я даўно марыла жыць у вёсцы. Курэй у мяне пад трыццаць. Гусі ёсць — дык у Гусевай жа! *(смяецца)*. Казу трымаю і двух казлянят. Малако і сыр свае, — працягвае старэйшына.



**Старэйшына ГУСЕВА і старшыня Лёзненскага сельскага Савета Святлана ПУКАВА.**

Цяпер разам з сяброўкай хочуць арандаваць або выкупіць будынак безгаспадарчай фермы. У прыватнасці, каб і трусоў разводзіць можна было. Гаспадарская жылка ў яе, напэўна, ад продкаў, якія стараліся жыць нябедна дзякуючы сваёй працы. І бацькі карову трымалі.

## Перанеслі дойку

Марыя Гусева стараецца, каб аднавяскоўцы былі больш дружнымі, разам наводзілі парадак у вёсцы. Першая «ластаўка» — сумеснае святкаванне Масленіцы.

У гэты дзень у вёску запрасілі самадзейных артыстаў. Арганізавалі катанне ў павозках. Старэйшына і яе сяброўка прыгатавалі бліны, зрабілі прызы для пераможцаў конкурсаў, сувеніры.

Каб мясцовыя даяркі таксама змаглі прыняць удзел у мерапрыемстве, кіраўніцтва гаспадаркі нават перанесла час дойкі...

У планах новыя святы: Дзень Перамогі, Купалле. Як і вырашэнне актуальных праблем.

— У нас, напрыклад, праблема з калонкамі: прарывы былі, вада залівала вуліцы. Трубы трэба мяняць. Ды і дарога дрэнная. Вясной будуць гэтымі пытаннямі займацца выканкам і ЖКГ. Як старэйшына буду кантраляваць. Яшчэ могілкі ў нас ёсць і помнік загінулым падчас вайны — таксама трэба, каб там быў парадак...

На жаль, тутэйшыя — людзі неарганізаваныя і не вельмі актыўныя. Няўжо, калі гадамі праблемныя пытанні не вырашаюцца, так і трэба? — разважае суразмоўца.

— Марыя Паўлаўна — прыклад таго, якім павінен быць старэйшына. Нягледзячы на тое, што на сваім «пасту» яна нядаўна, ужо добра сябе зарэкамендавала. Лічу, правільна, калі старэйшына адказвае за адну вёску. Упэўнена, што «распыляцца» ў гэтым пытанні не трэба. Па выніках работы раз у квартал у залежнасці ад колькасці двароў у населеным пункце старэйшыны фінансава заахвочваюцца, — каментуе старшыня Лёзненскага сельскага Савета Святлана ПУКАВА.

Дарэчы, усяго на тэрыторыі сельсавета 42 вёскі, а восць старэйшын — 16. Іх няма ў населеных пунктах, дзе пражывае менш за 10 чалавек. Але гэта зусім не азначае, што такія вёскі пакінуты без увагі — за парадкам у іх сочаць «адказныя», ды і старшыня сельскага Савета там не рэдкі госць.

## «Прэміяльныя» — старэйшынам

Пастановай прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і аблвыканкама распрацавана адпаведная інструкцыя пра меры маральнага і матэрыяльнага заахвочвання старэйшын.

Выплаты старэйшынам населеных пунктаў залежаць ад колькасці двароў. Да 20 двароў — 1 базавая велічыня; ад 21 да 50 — 1,5 базавай; ад 51 да 100 двароў — 2 базавыя велічыні. Больш за 100 двароў — 2,5 базавай за квартал. Фінансаванне — з мясцовых бюджэтаў.

Зразумела, старэйшынам прыемна, што іх праца ацэньваецца. Грошы невялікія, але, каб іх зарабіць, трэба пастарацца. Крытэрыяў ацэнкі работы нямала. Напрыклад, работа з насельніцтвам па пытаннях добраўпарадкавання, азелянення, адсутнасць звалак...

Добры старэйшына на вагу золата. І гэта не проста прыгожыя словы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*
*Лёзненскі раён.*

# Права на працу

**Дэпутаты ўсіх узроўняў не павінны заставацца ў баку ад пытанняў працаўладкавання, падкрэсліў старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК учора на сесіі абласнога Савета ў Гродне.**

Як паведамляе БЕЛТА, на сесіі абласнога Савета разглядалася пытанне аб выкананні падпраграмы «Садзейнічанне занятасці насельніцтва» Дзяржаўнай праграмы аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва на 2016—2020 гады і прынятых дадатковых мерах па працаўладкаванні незанятага насельніцтва.

Па словах Ігара Жука, узровень беспрацоўя ў Гродзенскай вобласці на 1 красавіка бягучага года склаў 1,1% да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. «Ствараюцца працоўныя месцы, узровень беспрацоўя і напружанасці на рынку працы невысокі», — адзначыў ён. У 2017 годзе ў рэгіёне плануецца працаўладкаваць не менш за 4,9 тысячы чалавек.

Пры гэтым Ігар Жук падкрэсліў, што дэпутацкі корпус павінен прымаць удзел у рэалізацыі пастаўленых задач у сферы занятасці насельніцтва.

Дэпутаты Гродзенскай вобласці таксама ўнеслі прапановы па Дэкрэце №3. «Мы звярнулі ўвагу на недапрацоўкі, якія павінны быць ліквідаваны, — сказаў старшыня абласнога Савета дэпутатаў. — Самае галоўнае — улічыць усе нюансы. Мы не павінны пакрыўдзіць тых людзей, якія ўцягнуты ў самазанятасць, уносяць свой пасільны ўклад у развіццё краіны».

# ВІШОЎСКІЯ ЗАСЕЎКІ

## У Бялыніцкім раёне прайшло свята першай баразны



**Хоць пасяўная ў Магілёўскай вобласці ўжо ідзе поўным ходам, традыцыйны абрад натхніў аграрнікаў на новыя рэкорды. Для правядзення аграрнага свята выбралі адну з найлепшых гаспадарак не толькі вобласці, але і краіны — СВК «Калгас «Радзіма». Гаспадарка моцная традыцыямі земляробства і сваім калектывам. На чале яе 36 гадоў стаіць Аляксандр Лапацентаў, чалавек, вядомы сваімі наватарскімі падыходамі да працы і вялікім клопатам пра людзей. Нездарма тут шмат моладзі, 70% работнікаў гаспадаркі — гэта выпускнікі тутэйшай Вішоўскай школы.**

На хлебаробнае свята прыехалі кіраўнікі і спецыялісты сельскагаспадарчай галіны на чале з губернатарам вобласці.

— Задачы на гэты год у нас сур'ёзныя — неабходна сабраць звыш мільёна трохсот тон збожжа, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ**. — Мы паставілі таксама мэту павялічыць вытворчасць цукровых буракоў, бульбы, ільну. Сённяшняе свята дае старт масавым работам на пасяўной Магілёўскай вобласці.

Уладзімір Даманеўскі звярнуў увагу на важнасць дагляду пасеваў. Ён даручыў правесці ў вобласці шэраг адукацыйных семінараў у красавіку і маі.

Права зрабіць першую баразну на полі выпала вопытнаму механізатару Анатолю Панцялееву *(на фота)*.

— «Радзіма» сёння гатовая да правядзення ўсіх сельскагаспадарчых работ, — **паведаміў кіраўнік гаспадаркі Аляксандр ЛАПАЦЕНТАЎ**. — Пасяўная — адказны момант, але фізічна гэта самая лёгкая, па маім вопыце, работа, якая праводзіцца ў сельскагаспадарчым годзе. Мы збіраемся сёлета пасеяць усе яравыя культуры на плошчы 3975 га. Тэхнічныя магчымасці, наяўнасць матэрыяльных і фінансавых сродкаў, людскія рэзервы, якія мы лічым галоўным здабыткам гаспадаркі, ёсць. Насенне ў нас таксама элітнае, а гэта значыць плюс 15—20% да ўраджайнасці. Усё астатняе залежыць ад чалавека. За кошт нашых напрацовак і людзей мы ўпэўнена сябе адчуваем.

Такое мерапрыемства ў вобласці праводзіцца ўжо другі год. Першае было ў Кіраўскім раёне. Трэба думаць, што гэта свята стане традыцыяй.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже права аренды земельного участка для строительства объекта по ул. Б. Троицкая в городе Гродно 26 апреля 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (с учетом деноминации), руб. | Сумма задатка (с учетом деноминации), руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (с учетом деноминации), руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Большая Троицкая между зданиями № 11 и № 7 | 0,0440 | 440100000002008781 | 36 252,22 | 4 000 | 3 020,31 | Строительство 2-этажного здания с мансардным этажом, включает торговый объект 150–200 кв. м, административные помещения 300–350 кв. м |

* – земельные участки имеют ограничения.
Победитель аукциона обязан:
в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;
приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;
осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;
возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 №49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».
В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.
Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».
При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:
1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона.
4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.
**Аукцион состоится 26 апреля 2017 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.**
Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет №57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 10 апреля по 20 апреля 2017 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: www.grodno.gov.by

НОВАЎВЯДЗЕННЕ

# КРАЕВУГОЛЬНЫ КАНТЭЙНЕР

## Да пачатку ліпеня ў Гродне ліквідуюць усе смеццеправоды

**Камунальнікі мяркуюць, як уціснуць у цесныя двары кантэйнерныя пляцоўкі, а жыхары прагназуюць новыя звалкі пад вокнамі.**

### ЗГОДА НЕ ПАТРЭБНА

Грандыёзны праект ускалыхнуў горад. Літаральна праз некалькі месяцаў гараджане пачнуць па-новаму ўтылізаваць сваё смецце. На змену зручнаму смеццеправоду прыйдуць вулічныя кантэйнерныя пляцоўкі. Такая альтэрнатыва выклікае ў многіх гараджан як мінімум неразуменне.

— Не ўсе жыхары хочуць бачыць у сябе пад акном такую пляцоўку, — зазначае **намеснік начальніка Гродзенскай жыллёва-камунальнай гаспадаркі Сяргей СЯМАШКА**, — адсюль і скаргі. Тады да праблемы далучаюцца мясцовыя ўлады, прыязджаюць на месца. Разглядаецца пытанне аб пераносе аб'екта, калі такая магчымасць ёсць.

Месцаў для збору смецця па горадзе будзе размешчана больш за 800. Лічба даволі вялікая, хаця такая пляцоўка знойдзе прапіску не ў кожным двары. Хтосьці будзе ад яе далей, хтосьці бліжэй. Па словах прадстаўніка ЖКГ, гэта і выклікае канфлікты.

— Мы сустракаемся з жыхарамі, тлумачым, што ўсе санітарныя нормы выконваюцца, — гаворыць Сяргей Сямашка. — У новых забудовах — гэта 20 метраў ад жылога дома, у старых, цесных дварах гэта можа быць і 10 метраў.

А што да згоды жыхароў... Дык яна і не патрэбна. Па заканадаўстве зямлёй распараджаюцца гарадскія ўлады — яны і вырашаюць, як і дзе размяшчаць шматлікія аб'екты.

### ПРАЦЭС ПАЙШОЎ

Работа пачалася ў Кастрычніцкім раёне, дзе будзе абсталявана больш за 400 пляцовак — амаль палова ад усёй колькасці. Пакуль зроблены замеры, вызначаны месцы, дзе-нідзе здымаецца грунт, паведамілі ў гарадской камунальнай гаспадарцы. Пасля гэтага пачнецца бетаніраванне і ўзвядзенне агароджы, каля якой адразу будуць высаджаны кусты. А ўжо затым на кожную пляцоўку паставяць некалькі кантэйнераў для раздзельнага збору смецця і адзін для змешанага.

— Па ўмовах тэндэра работы вядуць пінскія спецыялісты, — паведаміў Сяргей Сямашка, — металічныя кантэйнеры выбраў завод «Лідсельмаш» — іх спатрэбіцца амаль 10 тысяч, яшчэ 22 тысячы пластыкавых закупілі ў Чэхіі.

На новых пляцоўках паставяць і новыя кантэйнеры. Але не толькі. Вывозіць смецце будуць новыя смеццявозы з бункерамі, якія выпускае МАЗ. Яны прыстасаваны пад закрытыя металічныя кантэйнеры. З цягам часу такія кантэйнеры з'явяцца і на старых пляцоўках горада, размешчаных каля дамоў, у якіх адсутнічае смеццеправод.

Прыватны сектар забяспечваецца пластыкавымі кантэйнерамі для раздзельнага збору бытавых адходаў. Гаспадары заключаюць дагавор на вываз смецця і атрымліваюць бясплатна тры кантэйнеры. Усяго іх будзе ўстаноўлена звыш 20 тысяч. Праз некалькі месяцаў агульнымі сметнікамі пачнуць карыстацца ўсе гродзенцы. Як толькі ў двары з'явіцца кантэйнерная пляцоўка, смеццеправоды ў навакольных дамах ліквідуюць. Усяго пад гэты праект падпадае 650 дамоў, ці 2 тыс. смеццеправодаў.

### ЦІ ГАТОВЫ ГОРАД?

Маштабны праект гродзенцы шырока абмяркоўваюць на форумах і ў сацыяльных сетках. Некаторыя абураюцца, што пад кантэйнерныя пляцоўкі ідзе высечка зялёнай зоны — дрэў і кустоўя. Незадаволены і ўладальнікі аўтамабіляў, пазбаўленыя паркавачных месцаў.

Паназіраць, як вядуцца работы, я накіравалася на праспект Янкі Купалы. У двары жылога сектара раскапаны невялікі катлаван, агароджаны стужкай. Ці ведаюць жыхары двара, што тут будзе кантэйнерная пляцоўка? Міхаіл Мікітавіч з дома насупраць адказаў, што першы раз чуе. І пацікавіўся, для чаго гэта робіцца.

— У вас хутка смеццеправоды завараць, будзеце сюды смецце насіць...

— Дык тут жа чарговы сметнік утворыцца!

— Трэба культурна ўсё рабіць, тады і парадак будзе, — выказваю сваю пазіцыю Міхаілу Мікітавічу.

Мужчына згодны, што трэба павышаць культуру збору смецця, але не ўпэўнены, што ўсе жыхары гатовы да гэтага.

Маладая мама не рада, што кантэйнеры будуць стаяць побач з дзіцячай пляцоўкай, а малады чалавек сумна жартуе, што цяпер яго кватэра выходзіць вокнамі на сметнік.

Жанчына, якая назвалася Марыяй, занепакоена, што ёй спатрэбіцца ставіць на кухні тры вядры для кожнага віду смецця. Для гэтага папросту не хопіць месца. Хутчэй за ўсё, яна па-ранейшаму будзе збіраць адходы ў адну тару, тым больш што за раздзельны збор ніхто не заплаціць. У гэтай справе патрэбны стымул, лічыць Марыя. У Германіі, напрыклад, можна здаць нават пластыкавы посуд, а за бутэльку плацяць ад 15 да 50 цэнтаў. Здаць шкляныя і ПЭТ-бутэлькі можна ў крамах.

На думку Таццяны Рыгораўны, Гродна таксама ідзе па шляху прагрэсу, але жанчына задаецца пытаннем: як будзе ажыццяўляцца вываз смецця, хто будзе сачыць за станам гэтых месцаў? Ці гатовы да гэтага камунальнікі?

Мясцовыя дворнікі ўпэўнены, што работы ім прыбавіцца.


Пляцоўкі рыхтуюць «пад кантэйнеры».



Многія гараджане ўжо прывыклі да кантэйнераў.

### ПАТРЭБА ЧАСУ

Непапулярная ў гараджан мера — адзін з этапаў вялікага праекта, які на ўмовах пазыкі фінансуецца Сусветным банкам рэканструкцыі і развіцця. Кошт пытання — 42 млн долараў. Самым значным крокам стала будаўніцтва першага ў рэгіёне завода па сарціроўцы смецця. Завод пабудаваны недалёка ад Гродна, і ў год тут плануецца сартаваць 120 тыс. тон цвёрдых бытавых адходаў. Гэта дасць магчымасць атрымаць 33 тыс. тон другаснай сыравіны, якая патрэбна гродзенскім прадпрыемствам для выпуску рознай прадукцыі. Акрамя гэтага, стаіць задача разгрузіць палігон адходаў, які запоўнены на 83%. Кансервацыя смеццеправодаў — адзін з этапаў рэгіянальнай праграмы сарціроўкі смецця.

— Гэта работа пачалася некалькі гадоў таму, калі ў горадзе паўсюдна сталі ставіць кантэйнеры для раздзельнага збору адходаў, — зазначыў Сяргей Сямашка. — Цяпер завяршальны этап, і мы павінны гэту работу правесці. Жыхары ў большасці правільна ўспрымаюць гэту ідэю. А камусьці прыйдзецца змяніць свае звычкі...

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

### • ДВА ПОГЛЯДЫ НА ПРАБЛЕМУ

**Вадзім ПАЛЯКОЎ, начальнік Гродзенскай гарадской інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Канешне, існуе свядомая частка грамадзян. Але ў многіх выпадках мы сутыкаемся з недастатковай эканамічнай і экалагічнай адукацыяй. Зацікавіць чалавека можна, як правіла, толькі рублём. Напрыклад, так адбылося з металаломам, ад якога пачысціўся ўвесь лес, як толькі на яго падняўся кошт у нарыхтоўчых кантонах. Сарціроўка смецця таксама павінна быць выгаднай для жыхароў.

**Павел КОНЕЎ, начальнік вытворчага аддзела Гродзенскай гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

— Цікавы вопыт існуе ў нашых суседзяў-палякаў. Напрыклад, прыходзіць кантралёр на пляцоўку і бачыць, што ў кантэйнеры для шкла знаходзяцца пластыкавыя бутэлькі. Паколькі кантралёр не бачыў, хто гэта зрабіў, штраф выпісваецца на жыхароў усяго дома, якія карыстаюцца гэтай пляцоўкай. У выніку самі жыхары паведамляюць па тэлефоне пра парушальнікаў. Такім чынам палякі дабіваюцца парадку ў зборы бытавых адходаў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 4 красавіка 2017 года.**

# ЗНАХОДЗІЎСЯ Ў ЭПІЦЭНТРЫ...

## Сярод пацярпелых падчас выбуху ў метро ёсць беларус

**Па даных аддзялення пасольства ў Санкт-Пецярбургу, грамадзяніну нашай краіны, які пацярпеў у выніку тэракта, зроблена аперацыя, пагрозы жыццю няма. Стан сярэдні цяжкасці.**

Пацярпелы родам з Гродна, але працуе ў Санкт-Пецярбургу кандуктарам грузавых перавозак. У час выбуху ён знаходзіўся ў самым эпіцэнтры. Па словах мужчыны, ён не памятае першыя імгненні пасля выбуху. Калі прыйшоў у сябе, разам з яшчэ адным пацярпелым яны выламалі дзверы вагона і сталі дапамагаць выбірацца з яго параненым. Медыцынская дапамога падаспела хутка, праз паўгадзіны пасля выбуху беларуса ўжо даставілі ў 26 гарадскую бальніцу Пецярбурга. У мужчыны лопнулі перапонкі, маюцца шматлікія рваныя раны, асабліва траўмаваны шыя, рукі і ногі. Па ацэнцы медыкаў, у бальніцы ён будзе знаходзіцца яшчэ каля двух тыдняў.

— Зараз яго стан стабільны, ёсць пазітыўная дынаміка. Са сваякамі пацярпелага звязаліся, апавясцілі аб тым, што здарылася, — пракаментаваў **прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

Што да хуткай медыцынскай дапамогі, то беларусы, якія часова знаходзяцца ў Расіі, атрымліваюць яе бясплатна. Гэта вызначана Пагадненнем паміж урадамі дзвюх краін аб аказанні медыцынскай дапамогі.

Па апошніх даных, у выніку выбуху ў пецярбургскім метро загінула 14 чалавек. Яшчэ 49 цяпер знаходзяцца ў стацыянары.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Камунальныя стасункі

# ЦЯПЛО АДКЛЮЧАЦЬ НА ПРАЦЯГУ ТРОХ ДЗЁН...

## Канкрэтныя даты спынення падачы цяпла будуць вызначаць мясцовыя ўлады

**Ужо традыцыйна ацяпляльны сезон у нашай краіне завяршаецца ў першай палове красавіка. Спачатку цяпло перастаюць падаваць у грамадскія і адміністрацыйныя будынкі, а таксама на прадпрыемствы.**

Адпаведныя кранікі на цяпло для адміністрацыйных будынкаў у сталіцы пачалі закручваць з панядзелка, паведамляе **выконваючая абавязкі начальніка ўпраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Марына МАЛАЕВА**. Магчымыя тэрміны адключэння ацяплення ў жылым фондзе пакуль удакладняюцца, адзначылі ў Мінгарвыканкаме.

### У рэжыме працаплівання

**Кіраўнік прэс-службы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь АКСЦІЛОВІЧ** паведаміў карэспандэнту «Звязды», што рашэнне аб адключэнні цяпла прымаюць аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам. Звычайна сезон завяршаюць тады, калі на працягу 5 дзён трымаецца сярэднясутачная тэмпература паветра больш за 8 градусаў. Напрыклад, адміністрацыйныя будынкі Гродзенскай вобласці ўлады вырашылі не ацяпляць ужо з першых дзён красавіка. А ўвесь жылы фонд перавялі ў рэжым працаплівання.

Праўда, пакуль рашэнне аб завяршэнні ацяпляльнага сезона не прынята. «У сувязі з павышэннем тэмпературы паветра ў рэжым працаплівання пераводзіцца жылы фонд, інтэрнаты, гасцініцы, навучальныя ўстановы і аб'екты аховы здароўя», — адзначылі ў аддзеле энергетыкі, транспарту і сувязі Гродзенскага аблвыканкама. Там заўважылі, што мінулай вясной ацяпленне сталі адключаць таксама ў пачатку красавіка, аднак у трэцяй дэкадзе месяца з-за халоднага надвор'я цяпло на час вярнулася ў дзіцячыя сады, школы, бальніцы, а таксама жылы фонд Гродна і некаторых раёнаў вобласці.

### У сталічным рэгіёне рашэнне прынята

**Начальнік аддзела цеплавой гаспадаркі і энергетыкі ДА «Жыллёва-камунальная гаспадарка Мінскай вобласці» Таццяна ШМІГЕЛЬСКАЯ** паведаміла нашаму выданню аб тым, што рашэнне аб адключэнні цяпла ў цэнтральным рэгіёне краіны прынята менавіта ў аўторак. Гэты дакумент рэкамендуе адпаведным службам спыняць падачу цяпла ў дамы, калі на працягу 3 дзён на дварэ будзе трымацца сярэднясутачная тэмпература больш як плюс 8 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

# ХТО ПЯРОЙМЕ ЭСТАФЕТУ ПОЛАЦКА?

## Беларускія рэгіёны актыўна сапернічаюць за права правядзення Дня пісьменства

**Аб гэтым паведаміла міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, пад старшынствам якой прайшло пасяджэнне рабочай групы па падрыхтоўцы і правядзенні сёлетняга свята ў Полацку.**

«Ужо цяпер разглядаецца тэма Брэсцкай вобласці — у наступным годзе свята прапішацца там. Ёсць такое спаборніцтва паміж рэгіёнамі, якія актыўна звяртаюцца ў міністэрства, абгрунтоўваючы заяўкі на правядзенні Дня беларускага пісьменства менавіта ў іх», — сказала міністр.

Паводле яе слоў, у бягучым годзе ў Полацку будзе ярка прадстаўлена гісторыя, традыцыі, культура Беларусі. «Свята не будзе абмежавана адным нядзельным днём. Урачыстасці пачнуцца ў пятніцу, у суботу будзе адзначацца Дзень горада, а вечарам адбудзецца ўрачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства, яно пройдзе у абноўленым фармаце. Гэта дасць магчымасць прыцягнуць лепшыя творчыя калектывы, ва ўсёй красе выкарыстаць новыя тэхналогіі, экраны, якія вечарам асабліва эфектныя», — адзначыла міністр.

На пасяджэнні ў Полацку падрабязна разглядаліся пытанні падрыхтоўкі Дня пісьменства, выказваліся прапановы, удзельнікі пабывалі на будучых асноўных пляцоўках свята, паведамляе БЕЛТА.

■ Абітурыент-2017

# «ПАРОГІ» НА ЦТ НЕ ЗМЯНІЛІСЯ

**Міністэрства адукацыі вызначылася з тэставымі баламі, якія будуць сёлета прыраўноўвацца на цэнтралізаваным тэсціраванні да нездавальняючай адзнакі.**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Так, па беларускай або рускай мове нездавальняючымі будуць лічыцца адзнакі ад 0 да 19 балаў для філалагічных спецыяльнасцяў і ад 0 да 9 балаў — для астатніх спецыяльнасцяў.

Калі матэматыка, фізіка, хімія, біялогія з'яўляюцца першай профільнай дысцыплінай, то нездавальняючымі прызнаюцца адзнакі ад 0 да 14 балаў. Станоўчым вынікам лічацца 15 балаў і больш. Калі тыя ж дысцыпліны з'яўляюцца другім профільным іспытам, то планка патрабаванняў зніжаецца і абітурыенту дастаткова будзе набраць усяго 10 балаў (нездавальняючымі лічацца ад 0 да 9 балаў).

Калі першай профільнай дысцыплінай з'яўляюцца гісторыя Беларусі, сусветная гісторыя найноўшага часу, грамадазнаўства, геаграфія і замежныя мовы (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская), нездавальняючымі лічацца балы ад 0 да 19. Калі гэта другая профільная дысцыпліна, то трэба будзе набраць не менш як 15 балаў, каб быць дапушчаным да ўдзелу ў конкурсе.

Самыя нізкія парогавыя значэнні ўстаноўлены для абітурыентаў, якія будуць сёлета паступаць у ВНУ Мінабароны, МНС, Дзяржпагранкамітэта, на ваенныя факультэты грамадзянскіх ВНУ, а таксама ў вышэйшыя навучальныя ўстановы па групах спецыяльнасцяў «Вытворчасць, захоўванне і перапрацоўка прадукцыі раслінаводства», «Жывёлагадоўля. Рыбаводства. Пчалярства», «Сельскае будаўніцтва і ўладкаванне тэрыторый», «Меліярацыя і водная гаспадарка» і «Аграінжынерыя».

Для таго каб удзельнічаць у конкурсе, ім дастаткова будзе набраць усяго 5 балаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Руская мова», «Матэматыка», «Фізіка», «Хімія», «Біялогія», «Гісторыя Беларусі», «Сусветная гісторыя найноўшага часу», «Грамадазнаўства», «Геаграфія» і «Замежныя мовы». Такія ж балы ўстаноўлены і для абітурыентаў ВНУ Міністэрства ўнутраных спраў, але толькі для тых, хто будзе паступаць на вакантныя месцы ў рамках дадатковага набору.

Такім чынам «парогавыя» значэнні балаў на ЦТ, якія даваляюць удзельнічаць у конкурсе на званне студэнта ВНУ, засталіся на ўзроўні 2016 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by* ■

■ Навуковы падыход

# БОЛЬШ ГІБРЫДАЎ, МЕНШ «ХІМІІ»

**Беларускія вучоныя распрацавалі цэлую лінейку высокапрадукцыйных збожжавых, кармавых, злакавых і зернебабовых, якія дазваляюць максімальна выкарыстаць патэнцыял глебы і клімату нашай краіны. Так, па словах намесніка генеральнага дырэктара па навуцы НПЦ НАН Беларусі па земляробстве Дзмітрыя ЛУЖЫНСКАГА, сёлета 99 працэнтаў рапсу, пасеянага ў Беларусі, паспяхова перазімавала — у пераважнай большасці якраз беларускія сарты.**

— Гэта дазволіла нам упершыню за тры гады спадзявацца, што мы зможам цалкам забяспечыць сябе сыравінай для алейнатлушчавай прамысловасці, — адзначыў Дзмітрый Лужынскі. — Акрамя рапсу, добрыя вынікі атрымліваем па збожжавых: азімай і яравой пшаніцы, якія патэнцыйна могуць забяспечыць на нашых сярэднеўрадлівых глебах ураджай да 6—7 тон з гектара. Гэта значна скарачае выдаткі нашай краіны на імпарт харчавання. Яшчэ б адзначыў стварэння ў нашым цэнтры зернебабовых — яны здольны замяніць праслаўуты соевы шрот, які мы цалкам набываем па-за межамі краіны. Мы рэкамендуем пашырыць іх пасяўныя плошчы ў Беларусі да 350 тысяч гектараў, што дасць эканомію на імпарце ў 50 працэнтаў.

У той жа час, па словах спецыяліста, нашы гібрыды паспяхова канкуруюць з замежнымі, у прыватнасці заходнееўрапейскімі, сартамі па такой прыкмеце, як устойлівасць да неспрыяльных фактараў зімоўкі. Не апошнюю ролю ў справе маюць і ўгнаенні — па інфармацыі **дырэктара Інстытута глебазнаўства і аграхіміі НАН** **Віталія ЛАПЫ**, у краіне было распрацавана 69 новых формаў комплексных угнаенняў амаль для ўсіх культур, якія вырошчваюцца ў Беларусі. Вытворчасць запушчана на Гомельскім хімічным заводзе. Таксама эксперт адзначыў, што за апошнія восем гадоў у Беларусі фіксуецца станоўчая дынаміка змянення ўрадлівасці глебы. Прычына гэтага — правільнае і абгрунтаванае ўжыванне ўгнаенняў, а таксама іх дазіраванне.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*




# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У Масуле колькасць вымушаных перасяленцаў перавысіла 300 тысяч

Колькасць вымушаных перасяленцаў у выніку ваеннай аперацыі ў іракскім Масуле супраць баевікоў тэрарыстычнай арганізацыі «Ісламская дзяржава» перавысіла 300 тысяч чалавек, паведамляе Міжнародная арганізацыя па міграцыі. Іракскія сілавікі заўважылі, што імі ўзята пад кантроль дзве трэці тэрыторыі горада. У сваю чаргу прэзідэнт Ірака Фуад Масум назваў тое, што адбываецца ў Масуле, гуманітарнай катастрофай з-за гібелі мірных грамадзян, заявіўшы пры гэтым, што «трэба працягваць барацьбу, паколькі неразумна пакідаць горад у руках тэрарыстаў».

### Амерыканская кампанія Tesla па сваім рынкавым кошце абышла аўтагігант Ford

Пра гэта інфармавалі эксперты тэлекампаніі CNN. Яны звярнулі ўвагу на тое, што падчас таргоў на Нью-Ёркскай фондавай біржы акцыі Tesla падняліся ў цане. Гэтая акалічнасць павялічыла рынкавы кошт цэнных папер кампаніі да каля $48 млрд. Пры гэтым каціроўкі акцый Ford, наадварот, знізіліся, што прывяло да патанення кошту аўтагіганта на фондавым рынку да амаль $45 млрд. Як вядома, кампанія Tesla, заснаваная ў 2003 годзе, спецыялізуецца на выпуску электрамабіляў, а таксама займаецца стварэннем сонечных батарэй і іншых энергаакапляльных сістэм.

### Хакеры з КНДР выкралі ў Сеула план вайны супраць Паўночнай Карэі

Хакеры з КНДР узламалі сервер міністэрства абароны Паўднёвай Карэі і выкралі сакрэтны план баявых дзеянняў супраць Пхеньяна, паведамляе тэлеканал KBS. Па даных крыніцы тэлеканала, узломшчыкі атрымалі доступ да сакрэтных дакументаў першага ўзроўню, у тым ліку даных аператыўнага плана 5027. Ён апісвае сумесныя дзеянні Сеула і Вашынгтона ў выпадку пачатку поўнамаштабных ваенных дзеянняў на Карэйскім паўвостраве.

# «Полацкая зямля была цалкам суверэннай дзяржавай»

## Археолаг Вольга Ляўко даказала старажытнасць вытокаў беларускай дзяржаўнасці

**З археалагічнымі знаходкамі не паспрачаешся. Яны, у адрозненне нават ад старажытных летапісаў, не могуць быць прыдуманымі ці няправільна інтэрпрэтаванымі іх аўтарам. Археалагічны артэфакт, які знаходзіцца ў цэласным культурным слаі, — гэта як рэчавы доказ на руках у следчага. Толькі вердыкты выносіць не суддзя, а гісторык — чалавек, узброены ведамі пра мінулае і здольны выбудоўваць прычынна-выніковыя ланцужкі пэўных падзей... Загадчыцы Цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вользе ЛЯЎКО ўдалося выявіць новыя факты ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Яна даказала, што ў свой час Полацкае княства было абсалютна самастойнай, не залежнай ад іншых землеў. Цыкл навуковых прац Вольгі Ляўко «Вытокі беларускай дзяржаўнасці: Полацкая і Віцебская землі ў IX—XVIII стагоддзях» у 2016 годзе быў вылучаны на саісканне Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі. Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з даследчыцай, каб распытаць пра тыя адкрыцці, якія ёй удалося зрабіць.**



***— Вы ўжо шмат гадоў даследуеце гісторыю беларускай дзяржаўнасці. Цікава, з чаго пачыналі і як зразумелі, што будзеце займацца менавіта гэтай тэмай?***

— Археалогіяй я займаюся з 1976 года. Гэта была мая асноўная спецыялізацыя ў гісторыі. Даследавала гарады — спачатку Віцебск, культурныя слаі XIV—XVIII стагоддзяў, затым больш старажытныя напластаванні. Пасля пачала вывучаць іншыя гарады, замкі, могільнікі — словам, помнікаў назбіралася шмат. Бліжэй да 2000-х, калі я рыхтавала доктарскую дысертацыю, у пэўны момант зразумела, што проста гістарычнымі каментарыямі да археалагічнага матэрыялу не абыдуся.

У той час перад намі акурат паўстала пытанне аб напісанні шасцітомнай гісторыі Беларусі. Таму на свой археалагічны матэрыял я зірнула вачыма гісторыка, каб зразумець, што ён нам дае ў плане асэнсавання мінуўшчыны? Перада мной была пастаўлена задача напісаць пра ўдзелы Полацкай зямлі ў XII—XIII стагоддзях: разгледзець гарады, крэпасці, іншыя аб'екты, якія на ёй утварыліся, убачыць, хто аддзяліўся, а хто застаўся ў складзе агульнай тэрыторыі? Калі я ўсё прааналізавала, то зразумела, што матэрыялы раскопак даюць вялікія падставы для напісання гістарычных работ. Археалагічная крыніца адрозніваецца ад пісьмовай тым, што там ёсць факт, які застаецца нязменным, як бы ты ні хацеў яго трактаваць.

**«На працягу ўсёй гісторыі Полацка IX—XIII стагоддзяў мы назіраем, што, акрамя княскай улады, была моцнай і ўлада веча — народнага сходу».**

***— На якія звесткі з гісторыі беларускай дзяржаўнасці вашы работы дапамаглі зірнуць інакш?***

— Было такое распаўсюджанае меркаванне, што памёр полацкі князь Усяслаў і ў 1101 годзе ўся тэрыторыя была падзелена паміж яго сынамі — выдзеліласа 6 удзелаў, сярод якіх пералічвалі полацкі, віцебскі, друцкі, ізяслаўскі і іншыя ўдзелы. Насамрэч гэта было не так. Пасля смерці князя на полацкі прастол прыйшоў сын Барыс. Яго брат мінскі князь Глеб на той час ужо таксама валодаў удзелам. Усе астатнія ніякіх надзелаў не мелі — гэта былі ізгоі, князі, якія жылі ў сям'і, але без асабістых надзелаў. І толькі на працягу першых чвэрцяў XII стагоддзя з'яўляюцца новыя ўдзелы — ізяслаўскі, друцкі, віцебскі. Прычым ёсць археалагічныя даныя, якія выявілі, калі ўсё адбылося. Акурат гэтыя высновы былі зроблены мною. Я паказала, што князь, які сядзеў на полацкім стале, паралельна меў для сябе ўсе магчымасці, каб утварыць асабістае ўладанне. Гэта падцвярджае тэзіс пра незалежнасць Полацкай зямлі ад Кіева.

***— Прэзідэнт, азнаёміўшыся з вашай працай, сказаў, што звесткі, якія ў ёй змяшчаюцца, важна ўключыць у сучасныя падручнікі па гісторыі. Патлумачце, чаму гэтыя звесткі важна ведаць сённяшнім школьнікам? Як гэта дапамагае нам інакш зірнуць на сябе?***

— Важна ўяўляць, што кожны народ мае пэўны фундамент свайго існавання. Мы не ўзніклі з ніадкуль. Каб утварыўся пэўны этнас, з нейкімі адрознымі рысамі, ён павінен жыць разам на адной тэрыторыі, выпрацоўваць прынцыпы ўласнай культуры. Калі гэтага няма, значыць, няма і народа. Нам увесь час кажуць, маўляў, вы існуеце 25 гадоў, альбо вас можна адлічваць ад БНР, а раней вас не было, вы жылі ў іншых дзяржавах і не мелі нічога ўласнага, таму гаварыць пра беларусаў не выпадае... Хіба гэта правільна?! Нашы даныя акурат абвяргаюць такія меркаванні; яны сведчаць, што ў нас была гісторыя насельніцтва, якое пазней пачало звацца беларусамі. І гэта гісторыя звязана з канкрэтнай тэрыторыяй — нашай. Гэта зямля ўмацоўвалася, абгароджвалася, трымала свае межы. Унутры яе развівалася сетка гарадоў, вясковых селішчаў — адміністрацыйная структура, якая існуе і сёння, накшталт сучасных абласцей, раёнаў. Доказы наяўнасці такой структуры надзвычай важныя для таго, каб паказаць, што гэта ў нас было і яно засталося, што сучасныя раёны і вобласці бяруць свае карані з тых, больш ранніх тэрыторый. І кіраўніцкі апарат, які мы сёння маем, зноў жа бярэ свае карані яшчэ там. Мы маем аснову — тое, з чаго пачалася і ўзнікла сённяшняя дзяржава. Гэта была самастойная краіна, што развівалася па тых жа прынцыпах, на тых жа асновах, што і Кіеўская Русь. Яны ладзілі ці ваявалі, спрачаліся адно з адным — і ўсё дзеля таго, каб умацавацца і стаць больш трывалымі самім. Мелася ўласная княская дынастыя, якую не тасавалі, не перакідвалі з аднаго месца ў іншае, як у Кіеўскай Русі, дзе той, хто кіраваў цэнтрам, мог накіроўваць сваіх сыноў у розныя гарады. Тут такога не было: толькі той, хто жыў на Полацкай зямлі, кіраваў ёй. Гэта была цалкам суверэнная дзяржава. Цяпер, як і раней пры Савецкім Саюзе, у падручніках пішуць, што гэта частка вялікай старажытнарускай дзяржавы, якой кіраваў Кіеў. У гэтым істотная розніца нашага падыходу да старажытнай гісторыі.

***— У вашай працы пазначана, што станаўленне Полацка ў якасці цэнтра адбывалася на мясцовай племянной аснове, а Ноўгарад і Кіеў для гэтага запрашалі варагаў. Аднак у падручніках пішуць, што ў нас таксама кіравалі варагі?..***

— Так, у падручніках напісана, што, калі прыйшоў Рурык у Ноўгарад, ён праз два гады раздаў сваім мужам розныя гарады, у тым ліку Полацк, і ўлада варагаў распаўсюдзілася на ўсю зямлю, якую пачалі называць старажытнарускай дзяржавай... Але раздаць гарады — гэта не значыць пасадзіць на ўладу. Мясцовыя жыхары самі запрашалі таго ж Рурыка: «Прыйдзі — і кіруй намі». Іншымі словамі, яму загадвалі сесці на прастол і кіраваць. У Полацку ніхто так не рабіў, нікога не запрашалі. Падчас археалагічных раскопак не выяўлена ніякіх матэрыялаў, якія сведчылі б пра наяўнасць нейкай варажскай дружыны, якая ўтрымлівала б тут уладу. Больш за тое, на працягу ўсёй гісторыі Полацка IX—XIII стагоддзяў мы назіраем, што, акрамя княскай улады, была моцнай і ўлада веча — народнага сходу. У яго ўваходзілі баяры, якія валодалі землёй, і гарадскія патрыцыі, прадстаўнікі купецтва і рамесніцтва. І яны заўсёды патрабавалі, каб князь прытрымліваўся іх інтарэсаў. Усе вайсковыя паходы, якія арганізоўваліся палачанамі, былі не ад таго, што князю захацелася пайсці на некага з вайной, а ладзіліся яны з рашэння, адабрэння веча. Яны абкладвалі данінай сваіх суседзяў з Прыбалтыкі, заклікалі іх пад свае сцягі, калі даводзілася абараняцца ад наўгародцаў ці кіяўлян. Яшчэ важны момант: калі сабраць усе сведчанні часоў існавання Полацкай дзяржавы, мы нідзе не знойдзем, каб кіяўляне ішлі на сам Полацк — яны маглі рабіць набегі толькі на ўскраіны, пamежжа, але ніколі не наважваліся ісці на цэнтр, бо разумелі, што гэта была б вайна дзяржавы з дзяржавай. А так гэта былі толькі парубежныя грабеж, не больш.

***— Вы працуеце археолагам сорак гадоў, розныя бачылі часы, змены ў грамадстве. А як мяняецца стаўленне да нашай гістарычнай памяці?***

— Гэта складанае пытанне, бо мяняецца яно ў два супрацьлеглыя бакі. У нас шмат удзяляецца ўвагі пытанням, звязаным з духоўнай культурай народа, з культавымі помнікамі, аднаўляюцца некаторыя сярэдневяковыя рэзідэнцыі. Гэта ўсё робіцца дзеля развіцця турызму, прывабнасці нашай краіны, з пэўнымі асобнымі гістарычнымі рысамі. Але, на жаль, самае важнае — пытанне захавання і аховы ўсяго таго, што ў нас яшчэ ёсць у зямлі (а зямля наша надзвычай багатая на матэрыяльныя сведчанні, якія мы выкарыстоўваем для напісання гістарычных прац), — вырашаецца вельмі слаба. А, самае галоўнае, даследуецца надзвычай мала. Аддзелы культуры, мясцовыя музеі не спяшаюцца адукоўваць самі сябе ў гэтым кірунку і старацца абараніць і падняць узровень захоўвання тых аб'ектаў, за якія яны па законе адказваюць. Хацелася б, каб больш у нашай краіне было цікавасці да археалагічнай спадчыны. Магчыма, у сферы адукацыі трэба паразважаць над гэтым пытаннем — не толькі нашай гістарычнай памяці з пункту гледжання дзяржаўнасці, але і як спадчыны матэрыяльнай культуры.

Калі ўнясём гэта ў адукацыйную літаратуру, нашы дзеці будуць ведаць, чым могуць ганарыцца, бо часта яны лічаць, што нічога цікавага і новага ў падручніках няма... Але калі правільна расстаўлены акцэнты, калі дзіця бачыць, што галоўнае, пасля ў яго будуць зусім іншыя адносіны да культурнай мінуўшчыны.

***— Мне здаецца, у Беларусі пралягае цэлая прорва паміж дасведчанымі людзьмі і тымі, хто лічыць, што ў нашай гісторыі нічога не было...***

— Сітуацыю ніколі не выправіць толькі з аднаго кірунку. Ёй павінны займацца абодва бакі. Трэба, каб было не толькі жаданне даць веды, але і жаданне іх атрымаць. Калі б з'явілася зацікаўленасць у работнікаў культуры з тых жа музеяў, аддзелаў культуры, ідэалогіі і па справах моладзі!.. А яны ставяцца да гэтага як да вялікай абузы. Калі людзі, якія працуюць на месцах, пачнуць разумець свой абавязак у гэтай працы, пачнуць тым дзецям, якія прыходзяць у музей ці на нейкі аб'ект, расказваць ці паказваць менавіта так, як трэба, каб дзеці разумелі, пра што ім гавораць, тады ўсё зрушыцца з месца. А пакуль экскурсіі, якія праводзяцца ў нас у Беларусі, у большасці накіраваны на танны эфект — людзям распавядаюць нейкія байкі, што рабілася, згодна з паданнямі. Але што было насамрэч і што яно было ў дзесяць разоў цікавейшае, экскурсавод не ведае, бо не чытае кніг!

Мяне неяк спыталі, ці абавязкова перачытваць усе тыя працы, якія я напісала, я адказала, што неабавязкова. Але ўсё гэта можна выкласці папулярна, даступна, каб людзі ацанілі і зразумелі, — і гэта павінна быць у спецыяльнай літаратуры. І, натуральна, такую працу павінны рабіць не мы. Бо адзін чалавек не можа займацца выключна навуковай дзейнасцю, якая патрабуе вельмі вялікіх высілкаў, бо на доказ аднаго факта часам сыходзіць год працы, а то і больш, і быць папулярызатарам. Але перадаць гэты факт, таму, хто данясе яго больш папулярна, — мы заўсёды пойдзем на такое супрацоўніцтва.

**«Экскурсіі ў большасці накіраваны на танны эфект — людзям распавядаюць нейкія байкі, што рабілася, згодна з паданнямі. Але што было насамрэч і што яно было ў дзесяць разоў цікавейшае, экскурсавод не ведае, бо не чытае кніг!»**

***— Аднак у Еўропе і самі навукоўцы таксама пішуць папулярныя выданні...***

— Так, і я пішу. Але разарваць сваё жыццё на часткі не так проста. Трэба або заглыбіцца ў нешта фундаментальнае, або толькі павярхоўна пісаць некаторыя тэзісы. Я не супраць, выступаю перад людзьмі, расказваю, паказваю, тлумачу. Ва ўсіх раёнах, дзе працую, я маю наладжаныя кантакты з мясцовымі органамі культуры. Таму цудоўна ведаю, што робіцца на месцах. Там, дзе ўдаецца адшукаць агульную мову з людзьмі, работа ідзе. Аднак у нас вельмі шмат абласцей і раёнаў, не ахопленых археалагічнымі даследаваннямі. Спецыялісты ў многія раёны проста не даходзяць, таму што нас вельмі мала. Праца, якую мы робім, базіруецца на вялізным матэрыяле, які збіраўся дзесяцігоддзямі як намі, так і папярэднікамі. Але, каб бачны яе вынік, патрэбна зацікаўленасць усіх бакоў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
nina@zviazda.by

ГЛУША Адамовіча

# СУВЯЗЬ ПРАЗ ВАЙНУ

## Смаляне падарылі будучаму музею ўнікальную фотавыстаўку да фільма «Ідзі і глядзі»

**Газета працягвае публікацыю матэрыялаў у падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея Алеся Адамовіча. Сёлета мы адзначаем 90 гадоў з дня нараджэння пісьменніка, і падарунак ад Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта стаў сапраўдным сюрпрызам.**

### ФІЛЬМ, ЯКІ ЦЯЖКА ГЛЯДЗЕЦЬ

Дзевяць фатаграфій фармату А-3, зробленых падчас здымак фільма «Ідзі і глядзі» таленавітым савецкім фотамайстрам Мікалаем Гнісюком, цяпер знаходзяцца на часовым захоўванні ў Магілёўскай абласной бібліятэцы імя Леніна. Іх карэспандэнту "Звязды" перадала загадчык аддзела электронных рэсурсаў бібліятэкі Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта Таццяна Ладожына. Яна аўтар праекта «Расійскія акцёры беларускага кіно і беларускія акцёры расійскага кіно», у выніку якога была зроблена гэта выстаўка. А ў Магілёў трапіла дзякуючы плённаму супрацоўніцтву ўніверсітэта і абласной бібліятэкі. Спачатку размовы пра тое, што яна можа застацца ў вобласці, не было. Але калі смаляне даведаліся, што тут ствараецца музей Алеся Адамовіча і гэты працэс падтрымлівае найстарэйшая беларуская газета, то вырашылі зрабіць падарунак.

### ПА-ЗА КАДРАМ

Савецкае кіно нельга ўявіць сабе без творчасці Міколы Гнісюка, дзякуючы яму мы ведаем у твар славутых артыстаў таго перыяду. Яго фотаздымкі размяшчаліся на старонках часопіса «Советский экран», дзе ён працаваў, і беларускага аналага гэтага выдання «На экранах». Яго прозвішча ўвайшло ў сотню найлепшых фатографаў планеты. На жаль, ён рана пайшоў з жыцця. Але спадчыну таленавітага майстра добра прапагандуе яго жонка Надзея Майданская.

— Надзея Мікалаеўна кантактуе з кіношным сусветам, ведае многіх артыстаў, — расказвае Таццяна Ладожына падрабязнасці працы над праектам. — Яна адгукнулася на прапанову паўдзельнічаць у нашай справе і прыехала ў Смаленск. Партрэты акцёраў — гэта была галоўная тэма Міколы Гнісюка. А вось яго рэпартажныя здымкі мала вядомыя. І кадры са здымачнай пляцоўкі фільма Элема Клімава «Ідзі і глядзі», які стварайся сумеснымі намаганнямі кінастудый «Беларусьфільм» і «Масфільм», можна лічыць унікальнымі. Надзея Мікалаеўна спецыяльна падбірала іх для нашай выстаўкі.

Відавочцы расказвалі, што фільм «Ідзі і глядзі» ствараўся цяжка. Элем Клімаў успамінаў, як складана было прапускаць праз сябе гэтыя здымкі тым людзям, якія перажылі вайну. І нават Алесь Адамовіч аднойчы горка засумняваўся ўслых у тым, што фільм нехта будзе глядзець.


Падарунак ад смалян музею.

Нагадваем, што дабрачынны рахунак для збору сродкаў на рэканструкцыю будынка пад музей Алеся Адамовіча адкрыты пры **аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама;**

**р/р 3642129272326 у філіяле 703 ААТ СБ «Беларусбанк», код 760 г. Бабруйск, УНП 701226324.** Прызначэнне плацяжу **«Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча».** Увага! **Указанне назначэння плацяжу прынцыповае! Гэты доўгі сказ абавязкова павінен быць пазначаны на банкаўскім дакуменце.**

Балючы настрой амаль фізічна адчуваецца і на фота Міколы Гнісюка. Вось худзенькая фігурка Флёры — галоўнага героя фільма. Гэта першая роля расійскага акцёра Аляксея Краўчанкі, больш вядомага гледачу па стужках «Зорка», «Спецназ». Мала хто з сённяшніх яго прыхільнікаў пазнае ў ім сведку жахлівай нацысцкай карнай акцыі. Яшчэ адна галоўная гераіня фільма Вольга Міронава прысвяціла сябе настаўніцкай справе, але засталася ў кадры Гнісюка ў якасці актрысы.

### МОЛАДЗЬ ПАДЫХОДЗІЛА, КАБ СКАЗАЦЬ «ДЗЯКУЙ»

Тэма партызанскай барацьбы і спаленых вёсак агульная для Смаленскай і Магілёўскай абласцей. Таму творы Алеся Адамовіча выклікаюць у расіян шчырую цікавасць. Асабліва ў тых раёнах, дзе праводзіцца сур'ёзнае патрыятычнае выхаванне моладзі. Нягледзячы на тое, што пісьменнік ніяк не звязаны са Смаленшчынай, настаўнікі прапагандуюць яго творчасць сярод школьнікаў. Адзін з такіх раёнаў — Дземідаўскі, вядомы сваім ваенна-гістарычным фестывалем «Слабада партызанская». На тэрыторыі раёна знаходзіцца нацыянальны парк «Смаленскае Паазер'е», дзе дагэтуль захаваліся сляды акопаў і зямлянак. Ён, дарэчы, выступіў адным са спонсараў выстаўкі. І першы яе паказ адбыўся менавіта ў гэтым раёне. А 22 чэрвеня выстаўка пераехала ў Смаленск.

— Я не бралася казаць пра фільм «Ідзі і глядзі», пакуль не пачула экспертаў — крытыка Людмілу Перагудаву, Надзею Майданскую, — расказвае Таццяна Ладожына. — І зараз упэўнена: мы павінны расказваць дзецям пра вайну, потым яны самі ва ўсім разбяруцца. Маёй дачцэ 21 год, і яна спыталася, чаму я ёй раней не паказвала гэты фільм. Ён яе зачапіў, яна нават дапамагала мне выбіраць урыўкі для мерапрыемства. А потым прывяла на яго сяброўак. Тыя, хто ўпершыню бачыў урыўкі, потым пераглядалі фільм цалкам. Некаторыя бацькі казалі, што нашы дзеці да такога не падрыхтаваныя, не трэба гэта глядзець. Але чаму нельга? Зараз вунь у Расіі змагаюцца з сапраўднай праблемай, якая пагражае дзецям з інтэрнэта. Пад яе ўплывам яны здзяйсняюць самагубства — вось рэальная пагроза. Сёння дзеці глядзяць фільмы пра вампіраў і не баяцца. Гэтую фобію прыдумалі самі дарослыя. Мяне ўразіла, калі ў Смаленску на выстаўку завіталі юнакі проста з вуліцы. Хлопцам па 20 гадоў. Яны ўбачылі аб'яву і зайшлі. А потым падышлі, каб падзякаваць.

### КАГО ЛІЧЫЦЬ ГЕРОЕМ

— Цяпер паўсюдна праводзяцца ваенна-гістарычныя фестывалі, рэканструкцыі, гэта ўсё папулярна, але неяк павярхоўна, — разважае Таццяна Ладожына. — Трэба пасля іх размаўляць, аналізаваць, выказваць свае думкі. Мы, напрыклад, на тую выстаўку запрасілі студэнтаў трох вышэйшых навучальных устаноў і прапанавалі паўдзельнічаць у дыскусіі на тэму гераізму. Абмяркоўвалі на прыкладах герояў "Узыходжання" паводле Васіля Быкава. Сама вельмі люблю творчасць гэтага пісьменніка. І тэм для разважанняў у яго шмат. Вось хто ў гэтай аповесці герой — Сотнікаў або Рыбак? Дачка сказала, што Сотнікаў усё сам сапсаваў. Рыбак больш змыслы, але, можа, і трэба быць хітрэйшым? Навошта было падстаўляць усю вёску?

«Хатынскую аповесць» Адамовіча я чытала ў дзяцінстве, тады ў мяне не было магчымасці з'ездзіць у Хатынь. Пабывала там ужо дарослай — пасля рэканструкцыі. І была пад уражаннем. Сапраўдны гераізм сціплы. Некалькі гадоў таму я даведалася, што мая бабуля хавала ад немцаў яўрэйку, ратавала яе ад гета. Мая маці яшчэ маленькай бачыла ліст з Ізраіля ад той жанчыны з падзякай за выратаванне. Але бабуля ніколі нікому пра гэта не казала.

Мы наогул мала пра вайну гаворым. Звычайна ўсе прачынаюцца 9 мая або 22 чэрвеня. Вось вы робіце добрую справу, ствараеце музей Алеся Адамовіча. Я вельмі жадаю, каб усё ў вас склалася. У нас падобная сітуацыя з музеем Барыса Васільева. Яго таксама прасоўвае група энтузіястаў. Але гэта вельмі патрэбная справа.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


## ОБЪЯВЛЕНИЕ
о повторных торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот №1. Автомобиль УАЗ 31514, гос. №2778 BI-2, 1999 г.в., состояние условно-пригодное, начальная стоимость лота – 502,20 бел. руб. |
| **Собственник (владелец) имущества** | Открытое акционерное общество «Ладосно». |
| **Местонахождение имущества** | Лепельский р-н, д. Суша. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к хранителю имущества Ладик Дмитрию Сергеевичу, тел. моб. 8 (029) 595-56-98, тел. раб. 8 (02132) 23980 |
| **Наличие обременений** | Не имеется |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 4 мая 2017 года в 11.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 Судебный исполнитель – Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела – Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала №200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 15.00 3 мая 2017 года. Минимальная величина первого шага торгов – 5% от стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ
о торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот №1. Рассеиватель минеральных удобрений дисковый РДУ-3,0 в количестве трех единиц, новый, начальная стоимость лота – 27 807,02 бел. руб. |
| **Собственник (владелец) имущества** | Открытое акционерное общество «Технолит Полоцк» |
| **Местонахождение имущества** | г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к Табачниковой Светлане Александровне, тел. 8 (029) 712-75-13 |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «БПС-Сбербанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 04 мая 2017 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 Судебный исполнитель – Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела – Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома №3642903001037 филиала №200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 15.00 3 мая 2017 года. Минимальная величина первого шага торгов – 5% от стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |


## ХТО НА СВЕЦЕ ЗА ЎСІХ РАЗУМНЕЙШЫ?

### У Магілёве падвялі вынікі 21-га міжнароднага фестывалю "Мартовский лев"

За найвышэйшую ўзнагароду змагаліся 36 камандаў з Беларусі, Расіі і Літвы. Яны практыкаваліся ў гульнях на кемлівасць і вынаходлівасць. Па выніках усіх спаборніцтваў кубак фестывалю дастаўся камандзе з Вільнюса — ВКЛ. Але дзякуючы спонсару фестывалю Магілёўскаму аблвыканкаму ніводны з пераможцаў у кожнай асобнай гульні не застаўся без падарунка. З беларускіх камандаў на вышыні былі мінская "Зямляне" і гомельская "Гарачыя галовы". Магілёўская каманда «Прыступ ляноты і пакаранне» адзіная дала правільны адказ на самае складанае пытанне фестывалю. А студэнтка Беларуска-Расійскага ўніверсітэта Марына Голуб трапіла ў тройку наймацнейшых па гульні "Эрудыт-лато".

— Інтэлектуальныя гульні вельмі карысныя і неабходныя, — лічыць кіраўнік клуба інтэлектуальных гульняў БРУ Андрэй Яфрэмаў. — Яны папулярызуюць гісторыю, культуру, наогул навуку. Прымушаюць студэнтаў нечым цікавіцца, развівацца, пазнаваць. А гэта, у сваю чаргу, натхняе на адкрыцці і вынаходства.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


УНП 600041880

**14 апреля 2017 года в 14.00**

**в актовом зале общества состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Вишневка – 2010» с повесткой дня:**

«О продаже через аукцион не используемого в хозяйственных целях имущества ОАО «Вишневка – 2010».

Регистрация участников общего собрания акционеров будет осуществляться 14 апреля 2017 года с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания. Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения общества (Минский район, а. г. Вишневка, ул. Центральная, д. 1А) с 8.00 до 17.00 с 5 апреля по 13 апреля 2017 года.

Наблюдательный совет

Белинвестбанк

## ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «КУПИ КАРТУ VISA И ВЫИГРАЙ БИЛЕТЫ НА ЕВРОВИДЕНИЕ 2017!»

**1. Сведения об организаторе рекламной игры.**

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» (далее – Организатор), УНП 807000028, г. Минск, пр-т Машерова, 29, www.belinvestbank.by, belbb@belinvestbank.by

ОАО «Белинвестбанк» зарегистрировано постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 30.08.2001 № 232, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 807000028.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 03.06.2013 № 3.

**2. Наименование рекламной игры.**

Настоящая рекламная игра называется «Купи карту Visa и выиграй билеты на Евровидение 2017!» (далее – Рекламная игра), проводится в соответствии с условиями настоящих Правил согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания платы с участников Рекламной игры.

**3. Место (Территория) проведения Рекламной игры.**

Республика Беларусь

**4. Срок начала и окончания Рекламной игры.**

Рекламная игра проводится (включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Рекламной игры) в период с 6 апреля 2017 г. по 11 мая 2017 г.

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры (далее – Комиссия).**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Председатель комиссии | Филиппович Александр Александрович, заместитель председателя Правления ОАО «Белинвестбанк» |
| 2 | Члены комиссии | Маричев Андрей Викторович, начальник управления продаж розничных продуктов ОАО «Белинвестбанк» |
| 3 | | Король Ирина Александровна, главный специалист отдела рекламы управления территориального развития ОАО «Белинвестбанк» |
| 4 | | Сидляревич Екатерина Ивановна, специалист отдела рекламы управления территориального развития ОАО «Белинвестбанк» |
| 5 | | Гутковский Алексей Юрьевич, директор ИУП «Адверком» |

**6. Наименование банковских продуктов (услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:**

Рекламная игра проводится в целях повышения имиджа банка, а также продвижения банковских платежных карточек международной платежной системы Visa International, эмитированных ОАО «Белинвестбанк» (далее – Карточка).

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры:**

7.1. Участниками Рекламной игры могут быть физические лица – граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет.

7.2. Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 00.00 6 апреля 2017 г. по 23.59 20 апреля 2017 г. приобрести в структурном подразделении ОАО «Белинвестбанк» либо посредством системы дистанционного банковского обслуживания «Интернет-банкинг» или «Мобильный банкинг» ОАО «Белинвестбанк» Карточку Visa следующих типов: Visa Classic, Visa Gold, Visa Platinum, Visa Infinite.

7.3. При приобретении нескольких Карточек, участвующих в Рекламной игре, держатель Карточек фиксируется в качестве участника Рекламной игры в списке участников Рекламной игры (далее – Список участников) соответствующее количество раз.

7.4. Не участвуют в Рекламной игре держатели Карточек, которые оформили Карточку без взимания платы за выпуск и обслуживание Карточки в течение срока ее действия.

**8. Состав и размер призового фонда Рекламной игры.**

Призовой фонд включает в себя:

- один комплект билетов для одного победителя. Один комплект состоит из двух билетов на полуфинал Евровидение-2017 в г. Киеве, который состоится 11.05.2017 г. стоимостью 1626,08 (одна тысяча шестьсот двадцать шесть) белорусских рублей 8 копеек, формируемый за счет имущества заинтересованного лица – Visa International Service Association;

- денежный приз в размере 226,39 (двести двадцать шесть) белорусских рублей 39 копеек, формируемый за счет денежных средств Организатора – ОАО «Белинвестбанк».

Общий размер призового фонда составляет: 1852,47 (одна тысяча восемьсот пятьдесят два) белорусских рубля 47 копеек.

Проезд и проживание оплачивается самостоятельно победителем.

**9. Место, дата, время и порядок розыгрыша призов Рекламной игры и порядок определения победителей.**

9.1. Розыгрыш приза состоится в Центральном аппарате ОАО «Белинвестбанк» по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 29, 26 апреля 2017 года в 14.30.

9.2. Механика проведения розыгрышей призов.

К моменту розыгрыша данные об участниках Рекламной игры формируются Организатором в Список участников, который формируется из номеров банковских платежных карточек, выполнивших условия п. 7.2. Каждому участнику Рекламной игры в Списке участников присваивается индивидуальный номер, соответствующий порядковому номеру в Списке участников начиная с 000001.

Для проведения розыгрыша используются лототрон и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9.

За ходом розыгрыша призов следит Комиссия. Итоги розыгрыша призов Рекламной игры фиксируются в протоколе Комиссии, который составляется и подписывается присутствующими председателем и иными членами Комиссии.

9.3. Порядок проведения розыгрыша.

Определение выигрышного номера получателя приза происходит путем его формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера помещаются в барабан шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера участника Рекламной игры в Списке участников. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол Комиссии и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол Комиссии, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в Списке участников и при наличии совпадения выпавший номер шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в барабан, и извлекается следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в Списке участников.

Победитель получает один комплект, состоящий из двух билетов на полуфинал Евровидение-2017 в г. Киеве, который состоится 11.05.2017 г. и денежный приз в размере 226,39 (двести двадцать шесть) белорусских рублей 39 копеек.

**10. Срок и способ информирования победителей. Место, порядок и срок выдачи выигрышей.**

10.1. Победитель розыгрыша будет уведомлен о выигрыше почтовым уведомлением по адресу и телефону, которые клиент указал в качестве контактных при заполнении документов на выпуск Карточки, не позднее 27 апреля 2017 г.

10.2. Выдача приза победителю осуществляется при предъявлении оригинала документа, удостоверяющего личность победителя (или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности), по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 29, каб. 708 не позднее 29.04.2017 г.

10.3. В случае отказа победителя от получения приза, невыполнения победителем требований настоящих Правил или непредставления необходимых подтверждающих документов, указанных в подпункте 10.2 настоящего пункта, в установленные сроки и в установленном порядке, победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора.

10.4. Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена приза другим не допускается.

10.5. В момент выдачи приза с победителя Рекламной игры Организатором, выступающим налоговым агентом, производится удержание подоходного налога из денежной части приза, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь (денежная часть приза удерживается Организатором для оплаты подоходного налога в установленном порядке).

**11. Права и обязанности участников Игры.**

11.1. Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением призов.

11.2. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения в рамках данной Игры.

11.3. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

11.4. Победители, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения призов.

**12. Наименование печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**

Правила проведения Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Рекламной игры, а также размещению на корпоративном сайте Организатора www.belinvestbank.by.

Результаты проведения Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» до 11.05.2017 г. включительно, а также размещены на корпоративном сайте Организатора www.belinvestbank.by.

**13. Общие условия Рекламной игры.**

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех ее участников.

